№7 (365) 20 лютага 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Байкот — не «партызанка»**
Лявон Баршчэўскі, Віталь Тарас у палеміцы зь Зянонам Пазьняком.
старонка 3

**Зелімхан Яндарбіеў**
Апошнім, хто гутарыў зь ім перад тэрактам, была беларуская журналістка.
старонка 5

**У неба на «Сатане»**
Беларуская касьмічная праграма.
старонкі 8–9

**Рышард Куклінскі**
Самы карысны шпіён ЦРУ ў сацлягеры.
старонка 7

## Перамогі біятляністаў

**Беларускія біятляністы ў першы дзень чэмпіянату Эўропы ўзялі два залатыя і бронзавы мэдалі.** У мужчынскай спрынтэрскай гонцы перамог Аляксандар Сыман, трэцім быў Уладзімер Драчоў. Алена Зубрылава перамагла ў жаночай гонцы.

## Рыбакоў і Жураўкова — суседзі

**Былая кіраўніца справаў прэзыдэнта Галіна Жураўкова і былы старшыня НДТРК Ягор Рыбакоў знаходзяцца ў «амэрыканцы»,** сьледчым ізалятары КДБ. Справу Жураўковай вядзе камітэт фінансавых расьсьледаваньняў і КДБ, а Рыбакова — пракуратура. «Амэрыканка» — адзіная турма, дзе можна захаваць сапраўдную ізаляцыю. Знаходзіцца там яны маюць да суду. Або вызваленьня.

## Эстонцы дэпартуюць адстаўнікоў

**Улады Эстоніі хочуць адмовіць у грамадзянстве ўсім савецкім адстаўнікам,** якія жывуць у краіне. Дагэтуль толькі пэнсіянэры-памежнікі й былыя гэбісты, як ворагі эстонскай дзяржавы, ня мелі права на грамадзянства.

## Нідэрлянды безь нелегальных імігрантаў

**Галяндцы дэпартуюць 26 тыс. нелегальных імігрантаў** з былой Югаславіі, Чачэніі, Іраку, Аўганістану. Сярод іх — некалькі соцень беларусаў. Большасьць з упырхлікаў гадамі чакаюць разгляду заяваў на палітычны прытулак.

## Палёгка для беларускамоўнага

**Паводле зьвестак «НН», у Міністэрстве інфармацыі рыхтуецца праект закону, паводле якога з выдаўцоў беларускамоўнай кніжнай прадукцыі ня будзе зьбірацца падатак на даданую вартасьць.** Праект прадугледжвае ўвесьці гэткі льготны рэжым не на год, а адразу на некалькі гадоў — да 2008 г. Сытуацыя на кніжным рынку Беларусі — старонка 2.

**СМ; БелаПАН, радыё «Свобода»**

# Невядомы Быкаў



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тост «за снайпэра» мог бы стаць эпіграфам да аповесьці «Аўганец»**

**Старонка 2.**

# Бывай, саюзная дзяржава

## «Газпром» спыніў транзыт газу праз Беларусь

Беларусь гатовая стварыць паўнавартасную мытную мяжу з Расеяй. Менск палохае Маскву, Масква шантажуе Менск.

Газавы канфлікт дасягнуў беспрэцэдэнтнага накалу. У сераду а 18-й «Газпром» спыніў ня толькі пастаўкі газу ў Беларусь, але і транзыт яго праз Беларусь у Эўропу. «Белтрансгаз» абвінавачаны ў несанкцыянаваным адборы газу. Гэта адбылося 18 лютага. А да 17-га вышэйшыя ўрадоўцы краіны мусіла перадаць у адміністрацыю свае меркаваньні аб праекце дэкрэту «Пра ўнясеньне зьменаў і дапаўненьняў у Дэкрэт прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 27 студзеня 2003 г. №4». Ідзецца пра зьмены ў рэгуляваньні прадпрымальніцкай дзейнасьці, але найважнейшае ў дакумэнце — новыя правілы перавозу тавараў праз беларуска-расейскую мяжу. Пра гэта напісана вельмі сьціпла: «падпункт 1.30 выключыць». З ранейшага прэзыдэнцкага дэкрэту выключаецца пункт пра непадлегласьць мытнаму афармленьню пры ўвозе ў Беларусь тавараў, «якія паходзяць з трэціх краінаў і выпушчаныя ў свабоднае абарачэньне ў Расейскай Фэдэрацыі». Гэта дало падставу Беларускаму саюзу прадпрымальнікаў (БСП) у лісьце да віцэ-прэм'ера Андрэя Кабякова сьцьвярджаць, што новаўвядзеньне «раўназначна ўстанаўленьню паўнавартаснай мытнай мяжы».

Што да газу, Лукашэнка працягвае настойваць: ня можа быць і гаворкі аб перадачы «Белтрансгазу» ва ўласнасьць расейцам па нізкай цане. «Тое, што прапануецца, гэта турма», — вырвалася ў яго 13 лютага падчас наведваньня «Белтрансгазу». «Гэта было б злачынства», — падправіў яго чыноўнік. «Так, так, злачынства», — пагадзіўся Лукашэнка. Ён казаў пра шантаж з боку Масквы ды існую магчымасьць «пахаваньня» саюзу Беларусі і Расеі, чаго дапусьціць «ня хоча». Ён таксама ў чарговы раз пагражаў пераглядам дамоўленасьцяў Беларусі й Расеі ў вайсковай сфэры ў выпадку падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты. Ці стварэньне паўнавартаснай мяжы з Расеяй — з таго ж шэрагу?

«Стварэньне мытнай мяжы з Расеяй — сур'ёзнае палітычнае пытаньне, — кажа Аляксандар Патупа, старшыня БСП. — Да апошняга часу беларускія ўлады чакалі вынікаў перамоваў у Маскве, а калі яны скончыліся безвынікова, вырашылі, што надышоў час ствараць мытную мяжу».

Дэкрэт пагаршае становішча прадпрымальнікаў. Не сакрэт, што тавары на беларускія рэчавыя рынкі паступаюць у асноўным з Расеі. Расейскія фірмы маюць магчымасьць рабіць у Кітаі аптовыя закупкі зь вялізнымі зьніжкамі. Таму нядзіўна, што кітайская прадукцыя ў Маскве каштуе танней, чым у Пэкіне. Вось і вязуць беларускія чаўнакі гэты тавар праз нашу ўсходнюю мяжу, пры перасячэньні якой ня трэба плаціць нашай дзяржаве падатак на даданую вартасьць. ПДВ ідзе ў расейскі бюджэт. Страты Беларусі ацэньваюцца часам нават у 200 млн у год. Цікава, што СБП прапаноўваў ураду адмяніць гэты падатак для прадпрымальнікаў на іншых межах Беларусі. Было нават падлічана, што гэты крок прынясе ў дзяржаўную скарбонку 25 млн эўра, але ўрад прапанову праігнараваў.

«Зь іншага боку, з пазыцыі сувэрэнітэту краіны і магчымага руху Беларусі ў Эўропу, гэтае дзеяньне дастаткова станоўчае», — кажа А.Патупа пра праект новага прэзыдэнцкага дэкрэту. Ён лічыць, што на нашых вачах «развальваецца фантом пад назвай «саюзная дзяржава».

**Алег Тачоны**

## Тыдзень без чужога слова

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова. Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Адкрытая падпіска на другі квартал.

ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

## Нясвоечасовая «рыса»

Пара падвесьці рысу пад палемікай вакол артыкулу «Тлустая рыса пад мінулым». У ёй скрыжавалі пёры публіцысты незалежных выданьняў. Ніводная дзяржаўная газэта на палеміку не адгукнулася. Што можа быць больш паказальным? Ідэя «тлустай рысы» ўзамен за дэмакратыю нясвоечасовая. Гэта і ёсьць галоўнай высновай. Дыскусія была без карысьці? Не, абмеркаваныя ідэі калісьці будуць запатрабаваныя. Спадзяюся, што хутка. Тлустая рыса — гэта лепш, чым зьвядзеньне рахункаў, бо гэта шанец вярнуць краіну ў сям'ю эўрапейскіх дэмакратый. Праўда, для гэтага спачатку апазыцыя павінна стаць моцнаю, каб у краіне ўзьнікла раўнавага сілаў. Напрыклад, выйграць парлямэнцкія выбары або арганізаваць пасьпяховы байкот. (Што з гэтага — **старонка 3.**)

Рыхтуецца суд над падазраванымі ў дачыненьні да зьнікненьняў апазыцыянэраў. Ён мае распачацца не ў Беларусі, на жаль, а за мяжою. Магчыма, у Бэльгіі. А вось Галіна Жураўкова і Ягор Рыбакоў сядзяць у айчыннай турме. Ёсьць нейкая загадка ў такім адначасовым арышце і тых «зьлівах інфармацыі», якія яго атачаюць. Нікога ня дзівіць сам факт злоўжываньняў блізкіх да Лукашэнкі людзей. «Над Кіраўніцтвам справаў прэзыдэнта вісіць першародны грэх», — пішуць naviny.by. Чаму цяпер і чаму гэтых арыштавалі? Найпершае тлумачэньне — перад важнымі палітычнымі кампаніямі ўлады стараюцца хоць чым падтрымліваць сваю папулярнасьць. У такім разе, падвойны арышт сьведчыць пра гістэрыку ў калідорах улады, выкліканую газавым прэсынгам. «Газпром» уцягвае ў «канфлікт гаспадарчых суб'ектаў» польскіх і нямецкіх спажыўцоў газу. Упершыню за доўгі час вакол Беларусі пачынае разыгрывацца сур'ёзная міжнародная гульня, на якую адміністрацыя Лукашэнкі ня мае ўплыву.

Чытачы падтрымалі Рэдакцыю ў яе закліку «Ні рубля паразытам» («НН» №5). У пошце гэтага тыдня ёсьць нямала цікавых лістоў на гэтую тэму (**старонка 10**).

Эсэ Аляксандра Салжаніцына «Жыць без ілжы» зь цяжкасьцю, але паддалося перакладу на беларускую мову. Праблемы былі выкліканыя індывідуалізмам і рацыяналізмам беларусаў, што адрозьнівае нас ад расейцаў. Мы і з маной змагаемся інакш, аднак задумацца эсэ прымушае і нас, і цяпер (**старонка 15**).

**Андрэй Дынько**

## Не праз тарашкевіцу

**Часопіс «Бярозка» зачыніцца.** Апошнім нумарам стане сакавіцкі. «Комсомольская правда в Беларуси» пасьпяшалася паведаміць, што выданьне страціла папулярнасьць, перайшоўшы на тарашкевіцу ў пачатку 90-х. Гэта ня так. Наклад апошняга выпуску на тарашкевіцы (№6 за 1995 г.) быў 12 тыс. асобнікаў. Цяпер жа ён апусьціўся да 1400 асобнікаў. Міхась Скобла, былы намесьнік галоўнага рэдактара «Бярозкі», тлумачыць праблемы нерэгулярнасьцю дзяржаўнага фінансаваньня. Часта даводзілася выдаваць здвоеныя нумары, спрашчаўся зьмест і г.д.

**Адам Воршыч**

# Вайтовіч адмаўляе


PHOTO.BYMEDIA.NET

**На мінулым тыдні зьявілася інфармацыя: акадэмік Аляксандар Вайтовіч стварае блёк «Адраджэньне» з мэтай вылучэньня кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі на выбарах. Аднак А.Вайтовіч адмаўляе сваё дачыненьне да гэтага палітычнага праекту. «Думаю, нехта адмыслова ўкідвае гэтую інфармацыю», — сказаў ён карэспандэнту «НН». Палітоляг Віталь Сіліцкі лічыць, што інфармацыя пра «блёк Вайтовіча» можа быць звычайным «інфармацыйным сьмецьцем», задача якога — «давесьці сытуацыю з аб'яднаньнем апазыцыі да абсурду». Нават калі б блёк «Адраджэньне» сапраўды ствараўся, дык ня варта было б яго разглядаць усур'ёз, бо за ім няма структураў, людзей, рэсурсаў, лічыць Сіліцкі.**

**Акадэміку Вайтовічу 66 гадоў.**

# Невядомы Быкаў

**«За снайпэра» — гэты папулярны ў першыя лукашэнкаўскія гады тост можна было б зрабіць эпіграфам да аповесьці Васіля Быкава «Аўганец».**

Чалавек жыве дзеля аднаго-адзінага моманту. А што калі момант мінае? А нічога. Жыве далей, але ўжо бяз сэнсу. Думку гэтую выказаў Мішэль Уэльбэк, культавы францускі пісьменьнік. Можна спрачацца аб аўтарстве: хіба ня тое самае кажа Быкаў у «Трэцяй ракеце»? У «Сотнікаву»? Ступак з «Аўганца» таксама неспадзявана атрымлівае шанец спраўдзіць сваю мару — забіць дыктатара.

Пра гэта вэтэран Аўганістану мроіў, жывучы ў гаражы, бяз працы й ежы, кінуты жонкай. Дзеля гэтага ён заклаў той самы гараж — хацеў купіць зброю. Толькі дзеля гэтага, як падаецца спачатку і яму самому, пайшоў служыць у АМАП. Як Рыбак — у паліцыю.

І здрадзіў, як Рыбак. Але не тады, калі ня стрэліў у прэзыдэнта. Раней — калі, разганяючы дэманстрацыю, ціцянкоўскім жэстам падраў бел-чырвона-белы сьцяг. Такая вось быкаўская аналёгія: падрань сьцяг — як павесіць сябра.

Чаму ж ня стрэліў аўганец? Ня меў дастатковае матывацыі. Ягоныя сацыяльныя праблемы вырашыліся зь пераходам на поўнае дзяржзабесьпячэньне. Іншых прычынаў забіваць не было. Нацыянальнае «я» Ступака зламалі, прымусіўшы перайсьці на «гарадзкую» мову ды самому паверыць, што «гаварыць, як начальства», — прэстыжней. Чалавечае «я» расьцёрлі даўняй вэрбоўкай у КГБ, пра якую раптам нагадалі перад прыёмам у АМАП.

Аўтар скончыў аповесьць у 1998 г. Чытаючы, заглыбляешся ў знакі часу — шматтысячныя дэманстрацыі, закрыцьцё «паштовых скрынак» сакрэтнага прызначэньня, выразная настальгія па СССР, магутнае яшчэ пэнсіянэрска-адстаўніцкае лобі... Некаторыя дэталі настолькі ўжо забытыя, што ўспрымаюцца як ваенныя рэаліі іншых Быкаўскіх твораў.

У «Аўганцы» навязлая ў зубах «праўда вайны» стае проста праўдай жыцьця. Вайна, маладая дэмакратыя, рынкавы сацыялізм — антураж. Выбар заўсёды адзін. Між Богам і д'яблам. На пытаньне, што выбраў галоўны герой, Быкаў для сябе адказаў. Яшчэ ў сярэдзіне твору адстаўны энкавэдыст, былы сусед Ступака, сустрэўшы таго ў навюткім камуфляжы, гаворыць: «Вот и я когда-то… Такой молодой, подтянутый…»

Ці стрэліць Ступак? Мы для сябе на гэта пытаньне мусім яшчэ адказаць.

**Андрэй Скурко**

**Васіль Быкаў. Аўганец. — Дзеяслоў, №7' 2004.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Больш апакаліпсысу!

**Сапраўдныя фанаты готыкі тырчаць ад тэкстаў беларускіх лібэралаў.**

Літаратурны гіт тыдня «Гары Потэр і Ордэн Фэнікса» — кульбіт, прымітыўны закос пад сярэднявечную містыку. Сапраўдныя фанаты готыкі тырчаць ад тэкстаў беларускіх лібэралаў.

«Галеча, насельніцтва, якое сьпіваецца, сотні тысячаў людзей заўчасна адышлі на той сьвет, так і не дачакаўшыся «сумленнай» прыватызацыі, бюракратыя, як ракавая пухліна, аблытала гаспадарчы мэханізм...» Чытаючы хорар-сцэны лібэральнага місіянэра Леаніда Злотнікава, прыгадваеш маналёгі манахаў з «Імя Ружы». Крэзануты Сальватор з бэнэдыктынскага абацтва ведаў выйсьце: «Усе пакайцеся!» Сп.Злотнікаў таксама заклікае пакаяцца за грахоўную сувязь з д'яблам-сацыялізмам і спасьцігнуць Лёгас у тэкстах сьвятога пісьма фонаў Мізэса і Гаека.

Толькі ў аўтахтонных лібэралаў бачыў столькі спасылак на клясыкаў. З гэтага гледзішча нацыяналісты па канонах жанру павінны быць самымі кантужанымі. Кшталту анабаптыстаў, пратэстанцкае сэкты, сябры якой хадзілі без майткоў. Сакральных тэкстаў, акрамя «Касіў Ясь канюшыну», у іх няма, і выпіць яны ня дурні.

Беларускія гладстаны парушылі copyright Тумаша Аквінскага і Сігера Брабанцкага, сьцягнуўшы ў іх чорна-белы сьветапогляд, тэзыс аб сакральных кнігах як крыніцах ісьціны, анатэму на любы кантакт з чужым. Гэта дазваляе выявіць прычыны правалу лібэральнай прапаганды ў Беларусі: слабы апакаліптычны момант агітак.

Вось вы кажаце: Лукашэнка — дыктатар. А як наконт таго, каб у духу опусаў Банавэнтуры прапісаць: выразак з шасьцю пальцамі, асоба фаўнскага паходжаньня, сырэна з лускаватым хвастом, онакентаўр, чыё цела ніжэй пупа асьлінага, цыклёп, эпігіст з ротам на жываце і са ступакамі, павернутымі назад, каб непрыяцелі, якія за ім пагоняцца, заблыталіся...

Як кажуць аматары шырава, гэта торкае. Спасьцігнуўшы мэтафізычны жах рынкавага сацыялізму, электарат абавязкова працьверазее і пакладзе башку ў барацьбе за лібэральную Шамбалу.

**Лёлік Ушкін**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Выбар расьце

## тыражы падаюць

**Выстава «Кнігі Беларусі-2004» — найважнейшая падзея году для выдаўцоў. Аднак сёлета зь ёю канкуруе іншая, ня менш значная: перарэгістрацыя, якую ўсе выдавецкія структуры мусяць прайсьці да 1 сакавіка.**

Перарэгістрацыя ліцэнзіяў — не адзіная праблема кнігавыдаўцоў. Для выдавецтваў, што спэцыялізуюцца на беларускамоўнай літаратуры, мінулы год адзначыўся рэзкім падзеньнем накладаў. Па-беларуску кніжнай прадукцыі ў параўнаньні з папярэднім годам выйшла на 13,9% больш па назвах, але на 19,4% менш па тыражы (гл. табліцы).

Беларускія кнігі не былі абсалютнымі гаспадарамі на сёлетняй, адзінаццатай па ліку выставе. Удзел у ёй узялі 400 выдаўцоў і распаўсюднікаў, у тым ліку 180 беларускіх, больш за 60 расейскіх і каля 20 украінскіх. Інфармацыйныя стэнды зрабілі ЗША, Кітай, Нямеччына, Славакія, Францыя, Швэцыя і 22 арабскія краіны на стэндзе Лігі арабскіх дзяржаваў. На першым паверсе выстаўнага цэнтру «БелЭкспа» разьмясьцілася «офісная» частка, на другім ішоў раздробны продаж.

Запрашэньні на прэзэнтацыі гучалі толькі на «другой дзяржаўнай», але беларускія выдаўцы ўсё ж трымаліся беларускай. Былі й «разынкі»: так, «Мастацкая літаратура» на сваю прэзэнтацыю запрасіла Ўладзімера Пузыню з сурмой. Расейскае выдавецтва «Росмэн» прыехала з галоўнай сваёй «фішкай» — перакладам чарговага раману пра нізкаросага тынэйджэра з паранармальнымі здольнасьцямі. Прычым «Гары Потэр і Ордэн Фэнікса» на выдавецкім стэндзе чамусьці каштаваў даражэй, чым у раздробных гандляроў на другім паверсе. На ятках апошніх панавала прадукцыя расейскіх выдавецтваў. Беларускія, здавалася, траплялі туды толькі выпадкова.

Асноўная прычына — нізкая пакупніцкая здольнасьць чытачоў беларускамоўнае прадукцыі, лічыць галоўны рэдактар выдавецтва «Энцыкляпэдыкс» Зьміцер Колас: «Таму на першым пляне становіцца кілбаса, а кнігі, тэатры — на другім». Галоўны рэдактар выдавецтва «Тэхналёгія» Зьміцер Санько яшчэ больш катэгарычны: «Адбываецца разбурэньне беларускага кніжнага рынку, выкліканае нізкай пакупніцкай здольнасьцю». Дырэктар выдавецтва «Книжный дом» кандыдат філязофскіх навук Сяргей Кузьмін адзначае, што ў выніку такой сытуацыі выдаўцы пачынаюць арыентавацца на расейскі рынак: «Выжыць толькі на беларускім папросту немагчыма: чым большыя наклады, тым таньней кніга абыходзіцца».

Працяг на старонцы 4.

# Пра КДБ, АБСЭ і беларускую мову

Ніколі ня думаў, што мне давядзецца палемізаваць з паважаным спадаром Зянонам Пазьняком, але публікацыя ў «Народнай волі» за 11 лютага яго заклiку пад назвай «Байкот» ня можа быць пакінутая, прынамсі, без удакладненьняў.

Я маю права крыху выказацца на тэму байкоту. Бо ў 2000 г. быў арыштаваны і асуджаны на штраф «за заклікі да байкоту» тагачасных парлямэнцкіх выбараў. Агаварыся таксама, што балятавацца ні на якіх выбарах сам больш не зьбіраюся.

Байкот дык байкот — гэта права выбару кожнага. Тады, у 2000-м, байкот быў абсалютна зразумелы, бо існавала прызнаная шмат якімі цывілізаванымі краінамі наша Вярхоўная Рада і былі шанцы на далейшае непрызнаньне «палатак». Сёньня сытуацыя, трэба пагадзіцца, іншая. Заклікі правесьці выбары «пад міжнародным пратэктаратам» — гэта, на жаль, толькі прыгожыя словы. З кім з патэнцыйных «міжнародных пратэктараў» за амаль восем гадоў свайго знаходжаньня на Захадзе здолеў дамовіцца сп.Зянон — невядома. А калі сказаць адкрыта — *ні з кім.*

Я, дарэчы, быў настроены і на байкот прэзыдэнцкіх выбараў у 2001 г. Але ж сам сп.Зянон актыўна ўключыўся ў іх, яголныя калегі зьбіралі подпісы за вылучэньне яго кандыдатам у прэзыдэнты (я таксама падпісаўся ў яго падтрымку). Подпісаў тых, праўда, сабралі малавата...

Цяпер сп.Зянон прапануе фактычна паўтарыць тое самае ў 2006 г., хоць сёньня мне асабіста добра зразумела: ніводная партыя паасобку ў сёньняшніх варунках (а яны, хутчэй, будуць тады яшчэ горшыя) тых ста тысячаў подпісаў не зьбярэ. Ня мае такіх сіл і яго Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя. І што тады? Чакаць 2010-га, 2020-га, 2050-га году?.. Я гатовы байкатаваць любыя выбары, але калі *замест гэтага будзе прапанавана не фантомнае, а нейкае рэальнае* выйсьце.

Байкоту ж сёньня ўлады не баяцца. У «адзяржаўленай» дзяржаве яны прывязуць, загоняць, дастануць хадакамі з урнамі 75% насельніцтва — і патрэбныя ім лічбы атрымаюць. Па-мойму, дык *чым больш людзей на выбары рэальна ня прыйдуць, тым больш бюлетэняў можна сфальсыфікаваць.* Дарэчы, сам жа спадар Пазьняк гэты мэханізм цудоўна апісаў! Ці я тут чагосьці не разумею? Але, вядома ж, па-любому трэба шукаць выхаду да людзей — праз удзел у выбарах ці праз байкот...

Але ня тэма байкоту зачапіла мяне ў публікацыі сп.Пазьняка. У абрыньньні на галовы чытачоў абвінавачваньняў у атрыманьні замежных грантаў ён слова ў слова паўтарае Беларускае тэлебачаньне — хіба што замест ЦРУ падстаўляе звычнае КДБ... Але гэта эмоцыі... А цяпер факты...

Без узделу нямецкага, французкага, амэрыканскага, польскага ўрадаў, структур, створаных пры іх, незалежных фондаў ніколі б не атрымалі замежных прытулкаў Васіль Быкаў і Алесь Разанаў. Ня выйшлі б сотні самых лепшых арыгінальных і ў перакладзе на беларускую мову кніг у самых розных галінах ведаў. Даўно б загінулі ўсе, што не пад абцасам, літаратурныя і культурніцкія часопісы (тая ж «Спадчына»). Беларускія дзеці і дарослыя ня ўбачылі б ніводнага (!) мастацкага ці мультыплікацыйнага фільму, агучанага на беларускую мову. Не прайшлі б сотні выставаў беларускіх мастакоў, не было б соцень канцэртаў у той жа Нямеччыне альбо Францыі, ня зьдзейсьніліся былі б дзясяткі знакавых пастановак (узгадайма хоць бы прафінансаваную нямецкім бокам пастаноўку *на беларускай мове* ўнікальнай опэры Антона Генрыка Радзівіла)... Дарэчы, менавіта Германія на самым высокім узроўні першая прыняла рашэньне прызнаваць дакумэнты, што атрымаюць выпускнікі загнанага ўладамі ў падпольле Беларускага ліцэю...

Дый сёньняшні пэнсіянэр Ганс-Георг Вік зусім не падобны да ўсёмагутнага монстра, які прадае Беларусь у змове з КДБ і ФСБ. Пра гэта скажу ўпэўнена, бо ведаю яго прабеларускія — і зусім не прамаскоўскія! — погляды з размоў, што свайго часу меў зь ім сам-насам (добра, што мовай нямецкай валодаю)...


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У нас тут сёньня хапае рэальных бедаў, каб яшчэ траціць сілы на змаганьне з уяўнымі страшылкамі, выцягнутымі на паверхню паважаным спадаром Пазьняком. Да прыкладу — як дапамагчы *сёньня* (не праз тры і не праз пяць гадоў — бо памруць з голаду) дзясяткам і сотням беларускамоўных у Беларусі, што аказаліся фактычна без магчымасьці ўладкавацца на прыстойную працу? Добра ведаю гэта і па сваёй сям'і, якая ў поўным складзе пацярпела ад разгрому таго самага Ліцэю. Як дапамагчы таму самаму ТБМ, якое выкідае на вуліцу не Нямеччына і ня Францыя...

А можа, маладзейшыя ўсё-такі бачаць далей за нас? Можа, хай шукаюць сваіх шанцаў? На полі *прафэсійнай беларускай палітыкі* яшчэ ой як пуста — хопіць месца ўсім, хто хоча нешта рабіць! І будзе ў нас свой Саакашвілі — абавязкова будзе! І глядзець на гэта трэба з радасьцю і надзеяй.

Я гатовы байкатаваць любыя выбары, але калі замест гэтага будзе прапанавана не фантомнае, а нейкае рэальнае выйсьце. У нас тут сёньня хапае рэальных бедаў, каб яшчэ траціць сілы на змаганьне з уяўнымі страшылкамі.

**Лявон Баршчэўскі, ня-вораг Зянона Пазьняка**

# Байкот — не «партызанка»


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Віталь Тарас

Некаторыя зьявы — такія, як бел-чырвона-белы сьцяг, што лунае ў паветры, «Магутны Божа» ў выкананьні зводнага хору ці ўзыход сонца, — здольныя выклікаць адно толькі эмоцыі. Аб іх не дыскутуюць. Спробы абмеркаваць, скажам, вартасьці ўзыходу сонца або прапанаваць гэтую карціну прыроды відовішчу месяца на начным небасхіле здольныя выклікаць, бадай, толькі неўразуменьне.

Друкуючы артыкул Зянона Пазьняка «Байкот», газэта «Народная воля» выказала спадзеў на тое, што публікацыя выкліча дыскусію ў беларускім грамадзтве. Думаецца, аднак, што артыкул, а дакладней сказаць — заклік Пазьняка ў найменшай ступені разьлічаны на дыскусію. Публіцыстыка, асабліва партыйная публіцыстыка, скіраваная не да розуму, але да пачуцьцяў тых, на каго скіраваная. Магчыма, за гады эміграцыі публіцыстыка заснавальніка БНФ крыху паблякла ў вачох часткі грамадзтва, паколькі падобныя творы на падобную тэму друкуюцца ўжо ня першы раз. Але ад гэтага значнасьць тых твораў, як і значнасьць самой асобы Пазьняка для Беларусі, ня зьменшылася.

Можна знайсьці ў яго творах лягічныя «нестыкоўкі». Ёсьць яны і ў згаданым артыкуле. Катэгарычны імпэратыў аўтара наконт таго, што ў Беларусі не засталося незалежнай прэсы, не перашкаджае яму друкавацца ў газэце, якая, усё-такі, лічыцца незалежнай. Але вышукваць падобныя недарэчнасьці — справа марная. На ўзроўні канстатацыі, у вызначэньні агульнай палітычнае сытуацыі, у якой апынулася Беларусь, у вызначэньні пазыцыі Захаду што да Беларусі цяжка не пагадзіцца зь Зянонам Пазьняком. Можна не пагаджацца ў ацэнках ролі спадара Віка альбо кааліцыі «Пяцёрка-плюс». Але ж навошта? Які ў гэтым сэнс? Спрачацца з публіцыстычным заклікам, лёзунгам байкоту немагчыма ў прынцыпе!

Супраць заклiку можна выставіць толькі іншы заклік, або палітычны лёзунг дня. Ці ёсьць ён сёньня ў іншых палітычных партыяў, іх лідэраў? Даводзіцца канстатаваць, што няма — прынамсі, такога, які ведалі б і разумелі шырокія масы выбарцаў. Пяць асноўных задач, вылучаных «пяцёркай», могуць запомніцца хіба самой калясьцю, але не фармулёўкамі. Магчыма, лёзунг байкоту памылковы, бо ня ўлічвае настрояў тых самых выбарцаў. (Калі верыць спадару Манаеву і НІСЭПД, больш за 70% ужо вырашылі ўдзельнічаць у выбарах у палату.) Але ж аўтар «Байкоту» прапануе пэўны плян дзеяньняў і фактычна мабілізуе сваіх прыхільнікаў на выкананьне гэтага пляну. Як зьбіраецца мабілізоўваць сваіх прыхільнікаў апазыцыя на восеньскіх выбарах і ці гатовая яна да жорсткай барацьбы з рэжымам за кожны голас у кожным населеным пункце — невядома. Добра, калі адсутнасьць яснай палітычнай стратэгіі выкліканая мэтамі палітычнай канспірацыі альбо іншымі тактычнымі меркаваньнямі. Горш, калі зноў усе спадзяваньні на перамогу зьвязаныя зь дзядзькам Сэмам ці з рознымі іншымі эўрапейскімі дзядзькамі.

Пазыцыя Пазьняка можа падабацца альбо не падабацца, але яна ёсьць, і вельмі акрэсьленая, што ў нашыя дні вялікая рэдкасьць. Ці радавацца таму, што яна застаецца нязьменнай і нягнуткай, — іншая рэч. Між іншым, і ў гэтай пазыцыі можна заўважыць пэўныя зрухі. У артыкуле «Байкот», калі не памыляюся, упершыню, прынамсі ў яўнай форме, адсутнічае тэзыс аб акупаванай Беларусі. З акупантамі ж змагаюцца ня шляхам байкоту, а зусім іншымі мэтадамі. Заклік да байкоту ёсьць, як ні парадаксальна, заклікам дзейнічаць не партызанскімі, але палітычнымі мэтадамі, а гэта значыць — дзейнічаць зыходзячы з рэальнай абстаноўкі. Бо нельга проста абвесьціць байкот — а ну як не падтрымаюць? Трэба, каб ідэя байкоту авалодала масамі, трэба *гаварыць* зь людзьмі, прытым на іх тэрыторыі. Гаварыць зь беларусамі пра тое, як *самім* вырашаць свой лёс і лёс Беларусі. З гэтым тэзысам Пазьняка спрачацца не даводзіцца.

А хіба трэба спрачацца з узыходам сонца?

Добра, калі адсутнасьць яснай палітычнай стратэгіі выкліканая мэтамі палітычнай кансьпірацыі альбо іншымі тактычнымі меркаваньнямі. Горш, калі зноў усе спадзяваньні на перамогу зьвязаныя зь дзядзькам Сэмам.

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### $50 — так, «Белтрансгаз» — не

**18 лютага ў трэці раз за месяц расейскія пастаўшчыкі зьменшылі падачу газу ў Беларусь.** Напярэдадні «Газпром» пагражаў цалкам перакрыць кран. Закантрактаваныя на люты аб'ёмы паставак «Транс-Нафты» вычарпаныя, а ўгода з «Газпромам» не заключаная. У аўторак беларускі ўрад ухваліў праект крэдытнага пагадненьня з Расеяй. Масква запрапанавала крэдыт у 200 млн даляраў тэрмінам на пяць гадоў, каб Менск быў здольны расплачвацца за газ па вышэйшых цэнах. Рашэньне кабінэту можа быць сьведчаньнем таго, што Беларусь пагодзіцца купляць газ па больших тарыфах і не пагодзіцца на передачу газатранспартнай сыстэмы Расеі. Застаецца зразумець, ці пацягне правал энэргетычнага саюзу разрыў іншых саюзных дамоўленасьцяў.

### Эўрапейцаў цікавіць цэмэнт

**Буйны нямецкі канцэрн «Гайдэльбэргцэмэнт» гатовы ўлічваць спэцыфіку беларускага рынку ў працэсе супрацы зь Беларускім цэмэнтавым заводам у Касьцюковічах.** «Гайдэльбэргцэмэнт» прапануе розныя варыянты супрацоўніцтва — арэнда на 5 гадоў або перадача акцый у даверчае кіраваньне канцэрну — і не настойвае на прыватызацыі. Пры магутнасьці 850 тыс. т цэмэнту ў год, летась у Касьцюковічах вырабілі 716,8 тыс. т.

Яшчэ адзін сусьветны цэмэнтавы лідэр «CRH Group» (Ірляндыя) прагне ўдзелу ў мадэрнізацыі Красносельскага цэмэнтавага заводу ў Ваўкавыскім раёне. Кампанія «Lafarge» (Польшча) прапануе стварэньне СП на базе «Граніту» ў Мікашэвічах. А нямецкі «Кнауф» не губляе цікавасьці да «Белгіпсу».

### $440 млн — калгасам

**У 2004 г. у Рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі паступіць больш за 987,5 млрд руб.** Акрамя звычайных датацый, грошы пойдуць на мадэрнізацыю зернясховішчаў і зернетакоў і будаўніцтва заводу па перапрацоўцы й захаваньні насеньня кукурузы.

### Забароненыя «Гербэр» і «Тутэлі»

**Дзіцячае харчаваньне гэтых фірмаў не адпавядае крытэрам якасьці.** Такое рашэньне прыняла беларуская санслужба сьледам за расейскімі калегамі.

### Стаўка долу

**17 лютага базавая стаўка рэфінансаваньня зьнізілася яшчэ на 1%, да 27% гадавых.** З пачатку 2003 г. яна зьнізілася ўжо на 11% у сувязі з запавольваньнем інфляцыі.

**МБ; БелаПАН, «Белорусский рынок», gazeta.pl**

# Выбар расьце

## тыражы падаюць

Працяг са старонкі 1.

### Іншай дзяржавы няма

Дзяржаўная культурная палітыка шкодзіць ня менш за эканамічныя фактары. Адсоўваньне беларускай мовы на пэрыфэрыю грамадзкага жыцьця перашкаджае росту колькасьці беларускамоўных чытачоў. З.Колас, згадваючы пачатак незалежнасьці, прыводзіць факты, якія сёньня падаюцца фантастычнымі: «На пачатку 90-х, калі была іншая дзяржаўная палітыка, мы выдавалі дзіцячую літаратуру накладам 70 тысячаў — і ўсё імгненна прадавалася. Вядома, тады быў і вялікі інфармацыйны голад на такую літаратуру». З гэтым пагаджаецца й галоўны рэдактар дзяржаўнага выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Праўдзін: «Я сам пісьменьнік і ведаю: даводзіцца думаць пра камэрцыйны посьпех выданьняў. Калі кніга па-беларуску, дык гэта адразу ставіць пад сумнеў камэрцыйнасьць».

Выканаўчы дырэктар «Беларускага кнігазбору» Генадзь Вінярскі дадае, што яго выдавецтва ня ўдзельнічае ў выставе, бо ня бачыць практычнай карысьці: «Мы ўжо маем вызначанае кола чытачоў, і сёньня яго пашырыць немагчыма». Г.Вінярскі лічыць, што паспрыяць пашырэньню чытацкага кола магла б альтэрнатыўная сетка распаўсюду беларускамоўных кніг. Але дзяржаўную «Белкнігу» гэта не клапоціць. З.Колас зазначае: «Сам кнігагандаль пераважна кантралююць выдаўцы расейскамоўнай літаратуры. Гэтыя людзі ня бачаць месца для беларускамоўнай кнігі на рынку. Ня ўсе кнігарні бяруць кнігі па-беларуску нават на рэалізацыю. Калі й пагаджаюцца, дык толькі на некалькі асобнікаў, што істотна не ўплывае на наклады».

### Папера расейская, варштат беларускі

Беларускія выдаўцы існуюць у горшых умовах, чым расейскія. Падатак на даданую вартасьць у нас складае 18%, а ў Расеі — 10%. Амаль удвая меншы! Раней ільготамі карысталіся беларускамоўныя й дзіцячыя кнігі — сёньня і такіх ільготаў няма. Беларускамоўныя выданьні дзяржаўных выдавецтваў атрымліваюць датацыі на 50—70%, а то й на ўсе 90%, аднак гэта не ратуе пры заганнасьці сыстэмы кнігагандлю і заганнасьці беларускае мовы. «Дзяржава павінна дбаць пра сваю культуру. І ня толькі ў сваіх межах, але й за яе мяжой, — гаворыць З.Колас. — Для нас павінны быць прыкладам такія краіны, як Данія ці Ірляндыя: там існуюць вялікія датацыі на літаратуру. Яны пашыраюць сваю літаратуру ў сьвеце, бо ўласна ў ёй і захоўваюцца найбольшыя культурныя здабыткі народу».

С.Кузьмін узьнімае іншыя праблемы: «Паліграфічныя матэрыялы і папера — расейскай вытворчасьці». Гэтая залежнасьць нашага рынку ад расейскай паперы, на думку, Г.Вінярскага, неўзабаве адмоўна адаб'ецца на цэнах на кніжную прадукцыю: «Кнігі зноў падаражэюць: у Расеі растуць цэны на чыгуначныя перавозкі». Аднак і расейскі кніжны бізнэс не ў малой ступені залежыць ад Беларусі, дадае В.Праўдзін: «Яны ж свае кнігі друкуюць на нашых магутнасьцях, у нашых друкарнях! Выдавецкая база тут».

### Як і паўстагодзьдзя таму

Беларускае кнігавыданьне апошнім часам істотна ўзьняло ўзровень паліграфіі, лічыць Г.Вінярскі. Лепшай стала папера, афармленьне кніг, большае доля кніг, выдаваных у цьвёрдых вокладках. З другога боку, існуе й заўважная няроўнасьць. «У нас стālі выходзіць якасныя альбомныя выданьні — дарагія, шыкоўна афорленыя. Але шмат некамэрцыйных кніг (мастацкая, мэмуарная літаратура) выдаюцца вельмі сьціпла — на кепскай паперы, бедна афармленыя. Існуе велізарная прорва між гэтымі катэгорыямі кніг», — зазначае дырэктар «Беларускага кнігазбору».

Другая праблема аздабленьня кніг — уласна ілюстрацыйная. В.Праўдзін з гэтай нагоды наракае: «Мне 50 гадоў, а я гартаю кнігі й бачу малюнкі, якія памятаю зь дзяцінства».

### Сэрыяй выгадней

Выдавецтвы ахвотней бяруцца друкаваць сэрыі, чым адзінкавыя кнігі. Тут няма розьніцы між прыватнымі «Кніжным домам» ці «Беларускім кнігазборам» ды дзяржаўнай «Мастацкай літаратурай». Тлумачаць гэта выдаўцы законамі рынку й спажывецкімі зацікаўленьнямі. «Чалавечая псыхалёгія такая: калі ён пачаў набываць кнігі з сэрыі, дык імкнецца сабраць яе цалкам», — кажа В.Праўдзін.

Выдаўцы не адчуваюць канкурэнцыі міжсобку. Асноўную процівагу кнізе складаюць электронныя крыніцы інфармацыі — тэлевізар і Інтэрнэт. «Кнігавыданьне цярпіць ад распаўсюду новых інфармацыйных сродкаў. Пры канцы Савецкага Саюзу й на пачатку 90-х існавалі толькі 2-3 тэлеканалы. Сёньня іх дзясяткі, на розны густ. Калі чалавек прыходзіць стомлены з працы, ён хутчэй пачне глядзець тэлевізар, чым чытаць кнігу», — кажа З.Колас. У самім жа кніжным бізнэсе працы хапае ўсім. Праўда, няроўнасьць умоваў паміж дзяржаўнымі й прыватнымі выдавецтвамі выклікае ўнутрысцэхавыя праблемы й крыўды.

Дзяржвыдавецтва можа не клапаціцца пра распаўсюд сваёй кнігі. Замовы на школьныя падручнікі (што, бывае, атрымліваюць датацыі не на 70—90%, а нават на 120%) аддаюцца таксама найчасьцей дзяржаўным выдавецтвам: спэцыялізуецца на іх «Народная асьвета».

Г.Вінярскі адзначае, што дзяржвыдавецтвы існуюць амаль у цяплічных умовах: «Калі недзяржаўнае трапіць «у картатэку» й да канца месяца ня здолее выйсьці з пазык, у яго могуць арыштаваць рахунак ці яшчэ якія меры ўжыць. А дзяржаўныя могуць сядзець з пазыкамі богведама колькі часу. Дзяржвыдавецтвы пераважна займаюцца датацыйнымі кнігамі».

У свой чарод, В.Праўдзін скардзіцца, што «Мастацкая літаратура» знаходзіцца ў менш спрыяльных умовах, чым прыватнікі: «Мы мусім думаць па-дзяржаўнаму. Мы выдаём маладых у сэрыі «Дэбют», што недзяржаўнае выдавецтва будзе рабіць толькі за грошы. Гэта ўстаноўка дзяржавы: мы павінны выдаць чатыры дэбютныя кнігі ў год. Умовы для нас і недзяржаўных выдавецтваў няроўныя: у нас абмежаванае права выбару».

### «Дзюдзікі» па-наску

Вырашаць праблемы выдавецтвы імкнуцца па-рознаму. С.Кузьмін кажа, што яго «Дом» выдае папулярную літаратуру, але не цураецца й малапрыбытковай: «Найбольшай папулярнасьцю ў Беларусі карыстаюцца даведачная, дзіцячая, навучальная літаратура, навукова-папулярныя выданьні. Мастацкая прыбытку амаль не прыносіць». З.Колас бачыць пэрспэктывы беларускамоўнага кнігавыданьня ў тым, каб па-беларуску выдавалася як мага болей разнастайных кніг: «Галоўнае — пашыраць намэнклятуру назваў».

Менавіта зьменай рэдакцыйнай палітыкі В.Праўдзін тлумачыць рост продажаў прадукцыі «Мастацкай літаратуры»: «Цяпер нашы кнігі ляжаць на складзе ня больш за год». Сёньня выдавецтва арыентуецца на камэрцыйна запатрабаваныя літаратурныя жанры: заплянаваны выпуск сэрыі «Сучасны беларускі дэтэктыў», дзе будуць друкавацца творы Максіма Клімковіча, Мірослава Шайбака, Сяргея Трахімёнка, Людмілы Рублеўскай. Праўда, першы дэтэктыў выпушчаны новым кіраўніцтвам выдавецтва па-расейску — «Тамніца авальнага кабінэту» М.Чаргінца. Сэрыя будзе ісьці ў добрым пераплёце, добрым афармленьні. «Нас, беларускамоўных літаратараў і выдаўцоў, увесь час падштурхоўваюць да таго, каб ствараць нешта элітарнае і арыентаванае на пэўнае кола чытачоў. Ня думаю, што гэта правільна», — кажа В.Праўдзін.

**Вераніка Дзядок,**
**Зьміцер Дзядзенка**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Уладзімеру Русакевічу, міністру інфармацыі (зьлева) і Уладзімеру Дражыну, віцэ-прэм'еру ў сацыяльных пытаньнях, не ўдаецца палепшыць сытуацыю на кніжным рынку.**

**Колькасьць выдадзеных кніг**

| Год | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 |
|---|---|---|---|---|---|
| Беларускамоўнай літаратуры агулам | 647 | 761 | 822 | 752 | 857 |
| у т.л. у дзяржвыдавецтвах | 255 | 257 | 313 | 227 | 230 |
| Усяго літаратуры | 6064 | 7686 | 7944 | 7753 | 9148 |
| у т.л. у дзяржвыдавецтвах | 665 | 722 | 741 | 569 | 527 |

**Агульны тыраж выдадзеных кніг** (млн асобнікаў)

| Год | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 |
|---|---|---|---|---|---|
| Беларускамоўнай літаратуры агулам | 5,1 | 5,92 | 6,52 | 4,23 | 3,41 |
| у т.л. у дзяржвыдавецтвах | 3,96 | 3,996 | 4,93 | 2,81 | 1,55 |
| Усяго літаратуры | 63,3 | 61,63 | 55,01 | 44,25 | 48,41 |
| у т.л. у дзяржвыдавецтвах | 8,96 | 9,75 | 10,18 | 7,0 | 4,51 |

### Выдавецтвы — лідэры-2003

| | Колькасьць назваў | Тыраж, тыс. |
|---|---|---|
| Сучасны літаратар | 269 | 2609 |
| Кніжны дом | 157 | 2534 |
| Папуры | 230 | 2468 |
| Аверсэў | 186 | 2129 |
| Юніпрэс | 138 | 1047 |
| Белы вецер | 307 | 748 |
| Адукацыя і выхаваньне | 50 | 396 |
| ТэтраСыстэмс | 76 | 290 |
| Новыя веды | 59 | 229 |

### Па пяць кніжак на беларуса

**Сярэдні наклад кніг, выдадзеных у Беларусі ў 2003 г., — 5300 асобнікаў (у 2002 г. — 5700, у 2001 г. — 6900). На аднаго жыхара краіны ў 2003 г. было выдадзена 4,9 кнігі й брашуры, у 2002 г. — 4,5, у 2001 г. — 6,9. На дзяржзамову ў 2003 г. дзяржвыдавецтвы выпусьцілі 359 назваў накладам 3980 тыс. асобнікаў.**

### Прыярытэты-2003

**Прыярытэтнымі ў 2003 г. (а значыць, і найперш датацыйнымі) былі:**

**кнігі «Памяць»: выпушчана 15;**

**кнігі для папаўненьня публічных бібліятэк (85 назваў агульным накладам 114 700 асобнікаў);**

**кнігі шрыфтам Брайля для дзяцей — інвалідаў па зроку (4 назвы мастацкай літаратуры ў 34 кнігах, а таксама 9 падручнікаў у 34 кнігах).**

### Кубліцкі з Заблоцкім — найлепшыя

**Напярэдадні выставы «Кнігі Беларусі-2004» былі падведзеныя вынікі конкурсу «Мастацтва кнігі», у якім бралі ўдзел 46 выдавецтваў з 252 выданьнямі. Дыплём «За найлепшае выданьне году», упершыню з 1999 г., атрымала дзяржаўнае выдавецтва.**

**Найлепшымі выданьнямі году названыя:**

**1. «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» Пятра Васючэнкі («Мастацкая літаратура»);**

**2. «Песьня аб паходзе Ігара» («Кавалер паблішэрс»);**

**3. Слоўнік «Чую, бачу, гавару» Анатоля Клышкі («Асар»).**

**Апрача таго, былі вызначаныя найлепшыя выданьні яшчэ ў 15 намінацыях. Найлепшым літаратурна-мастацкім выданьнем была названая «Ладзьдзя роспачы» Уладзімера Караткевіча, найлепшым фотаальбомам — «Пад небам Беларусі» Анатоля Клешчука. За высокую выдавецкую культуру асобнымі дыплёмамі былі адзначаныя альбомы Міхася Раманюка «Беларускія народныя строі», Івана Бархаткова «Жывапіс» і Дзяніса Раманюка «Мая краіна Беларусь».**

Вольга Караткевіч

# Ён баяўся толькі Бога

## Перад сьмерцю Яндарбіеў маліўся за сяброў зь Беларусі



Яндарбіеў каля ўласнае хаты ў Досе.




Зь Зелімханам Яндарбіевым я пазнаёмілася па-журналісцку. Адзін зь сяброў, які працаваў на канале ОРТ, паехаў разам са здымачнай групай у Катар, каб зрабіць сюжэт пра жыцьцё былога прэзыдэнта Чачэніі. Адбывалася гэта пасьля падзеяў у «Норд-Осьце», і таму ўвага да гэтага чалавека была вялікая: чачэнская тэма зноў актуалізавалася. Я патэлефанавала калегу з ОРТ і папрасіла ўведаць нейкі кантакт зь Яндарбіевым, каб запісаць інтэрвію.

Калі званіла, вельмі хвалявался — які ж ён? Пачула вельмі спакойны, інтэлігентны, упэўнены голас. Я назвалася, і голас Яндарбіева стаў вельмі вясёлы: «Як жыцьцё? Скажэце, а як там, у Беларусі, пажывае мой калега па літаратурных курсах Лёнік Галубовіч? Перадайце яму прывітаньне…» Другое, што пачула: «Відаць, не зусім кепска, што зачыніліся гэтыя датаваныя дзяржавай літаратурныя часопісы ў Беларусі, — можа, зьменіцца стаўленьне да творчасьці?» Трэцяе — «А Лукашэнка ўсё ж трошкі пінае Пуціна за транзыт паліва праз Беларусь». Падумалася мне — аказваецца, у такой сытуацыі яму да ўсяго клопат.

Я перадала Лёніку прывітаньне, і ён мне крыху расказаў пра Яндарбіева. Сказаў, што ён таленавіты паэт і вельмі прынцыповы чалавек. Такі прынцыповы, што нават пабойваліся яго.

У траўні мінулага году Зелімхан Яндарбіеў даслаў мне праз Інтэрнэт цікавую гісторыю, як катарскі канал «Аль-Джазіра» («Выспа») асьвятляў беларускі рэфэрэндум 1995 году. Аказалася, што там ёсьць усходнеэўрапейскі аддзел. Гаварылі пра гэты рэфэрэндум як пра пачатак разбурэньня толькі-толькі ачунялай беларускай нацыянальнай сьвядомасьці. Яндарбіеў часта казаў, што ня варта хвалявацца за незалежнасьць Беларусі — яна ёсьць, яна будзе. Варта хвалявацца за магчымую культурную асыміляцыю.

Калі Яндарбіеў служыў у савецкім войску, наведаў Берасьце. Ягоныя словы пра Беларусь былі такія сьветлыя, добрыя і аптымістычныя, што адразу хацелася пераказаць нашым палітыкам.

Я праводзіла апытаньне для часопісу «Arche» «Ці застаецца Расея імпэрыяй». Вырашылі запытацца й Яндарбіева. Ён адказаў, а я прынагодна папрасіла яго даслаць вершы. Ён прыслаў частку. Вершы мяне моцна ўразілі, і я перадала іх Рыгору Барадуліну. Рыгор Барадулін і пагадзіўся перакласьці іх ды іншыя на беларускую мову. Ад гэтай навіны голас Зелімхана Яндарбіева гучаў шчасьлівым. Ён вывучыў, як правільна вымаўляць пабеларуску «Дзядзька Рыгор», «Жыве Беларусь», «Чачэнія — сэрца майго сьвятыня», — так будзе называцца яго зборнік на беларускай мове. Вельмі спадзяваўся, што калі выйдзе ягоная кніга, зможа нешта сказаць па-беларуску тым, хто яе будзе чытаць.

Калі ў чэрвені мінулага году памёр Васіль Быкаў, Яндарбіеў адразу адгукнуўся на гэтую сьмерць. Вершам.

25 чэрвеня прыйшла інфармацыя, што спэцыяльны камітэт ААН на прапанову Расеі ўнёс Яндарбіева ў сьпіс асобаў, падазраваных у супрацоўніцтве з «Аль-Каідай» і «Талібанам». У гэты дзень, калі Яндарбіеў мне патэлефанаваў, яго голас быў зусім іншы — вельмі расхваляваны. Аказалася, што ён хваляваўся за тое, якой будзе рэакцыя знаёмых зь Беларусі. Ён сказаў: «Вольга, калі ласка, я Вас вельмі прашу: перадайце ўсім, што я ніколі не сустракаўся зь людзьмі, якія б называліся членамі «Аль-Каіды». У час, калі я кантактаваў у якасьці прадстаўніка Аслана Масхадава з кіраўніцтвам «Талібану», іншыя дзяржавы на афіцыйным узроўні таксама зь імі кантактавалі, бо «Талібан» кіраваў Аўганістанам. Калі даведаўся, што адбываецца ў «Норд-Осьце», пазваніў Бараеву і запытаўся, ці ў курсе апэрацыі Масхадаў. Вось увесь мой удзел у гэтай падзеі. Я проста не хачу, каб мой шлях, мая барацьба, мае памкненьні і спробы спыніць вайну ў Чачэніі такім чынам выкарыстоўваліся».

Калі расейскія ўлады зноў запатрабавалі ад Катару выдачы Яндарбіева, ён, камэнтуючы магчымае разьвіцьцё падзеяў, сказаў, што ніколі ня будзе хавацца. «Калі ты абраў свабоду, ты павінен разумець, што яе заўсёды будуць спрабаваць забраць. Галоўнае — ня тое, якая цана, галоўнае — за што. Я прайду свой шлях да канца».

Калі я запыталася ў Зелімхана Яндарбіева, як жа так сталася, што пачалася другая чачэнская вайна, ён расказаў, што, будучы кіраўніком, раіў паплечнікам ды іншым адмовіцца ад выбараў, не дзяліць уладу, а пачаць будаваць чачэнскія дзяржаўныя інстытуты. Пасьля падпісаньня пагадненьня зь Ельцыным пра добрасуседзкія дачыненьні была магчымасьць не дапусьціць вайны. Ён расказваў пра сустрэчу зь Ельцыным, у часе якой аднаго з удзельнікаў Ельцын называў «сынок». Маўляў, памаўчы. Гэта ўразіла Яндарбіева, ён сказаў: «Нейкае пахванства ў іх, нейкая незразумеласьць… Чаму яны ня думаюць пра сябе, а думаюць, як захаваць ці аднавіць тэрыторыі?»

Паводле словаў Яндарбіева, ён паабяцаў, што, калі сытуацыя стабілізуецца, пакіне ўладу і будзе займацца іншым. Ён прайграў выбары, але застаўся пры Масхадаву як ягоны прадстаўнік у краінах Блізкага Ўсходу.

Мяне заўсёды ўражвала ягоная даступнасьць і адкрытасьць. Ён сапраўды не хаваўся, прымаў журналістаў з розных краінаў, усім раздаваў свае тэлефоны. Рады быў кожнаму кантакту. Ніколі ў размовах са мною не выказваўся рэзка. Спакойна, упэўнена, з разуменьнем таго, хто ён для расейцаў. Шкадаваў ня толькі забітых чачэнцаў, шкадаваў усіх. Маліўся за канец вайны. Вайну паміж суседнімі народамі называў трагічнай памылкай, але верыў у незалежнасьць сваёй Радзімы.

Аднойчы я атрымала ад яго электронны ліст, які не магла прачытаць, бо быў нейкім чынам закадаваны. Я да яго не дазванілася, але старалася, бо чакала вершы. Аказалася, што ў гэты дзень забілі Зелімханавага пляменьніка — шаснаццацігадовага хлопца, якога выхоўвала сям'я Яндарбіева. У чачэнцаў вельмі важна, каб у доме быў мужчына. Два старэйшыя сыны Яндарбіева забітыя. Два ягоныя браты былі забітыя ў часе вайны, а пляменьнік называў яго татам, а яго жонку — мамай. І суцяшаў — Зелімхан, у цябе ёсьць старэйшы сын. Пляменьнік напярэдадні сваёй сьмерці прасіў сям'ю маліцца, каб яго не ўзялі ў палон расейскія салдаты.

У Беларусь тым, каго Яндарбіеў ведаў, ён пасылаў у падарунак фінікі. А за два тыдні да забойства еў смачны чорны беларускі хлеб. Спартоўцы з Катару, якія былі на зборах у Менску, прывезлі яму пяць боханаў. Успрыняў Яндарбіеў гэта вельмі чульліва. Вельмі радаваўся і шкадаваў, што ня можа наведаць Беларусь. Яму даслалі беларускі нацыянальны сьцяг. А сымболіку чачэнскага — дзе на зялёным палатне бел-чырвона-белая стужка — тлумачыў так: зялёны фон — гэта нашая радзіма, горы, даліны, жыцьцё; белы колер — гэта пэрыяд міру, чырвоны — пэрыяд праліванай крыві.

Ён гаварыў, што баіцца толькі Бога. Не прапускаў ніводнай малітвы. На падзеі, якія, напрыклад, у мяне выклікалі эмацыйную рэакцыю, ён рэагаваў так: «Алаг распараджаецца намі». Аднойчы сказаў такую фразу: «Як добра, што гэтым сьветам не кіруе нават самы лепшы зь людзей, а ўсё ў руках Бога».

Апошні раз я гаварыла зь ім за дзьве гадзіны да гібелі. Яндарбіеў цікавіўся, як здароўе Рыгора Барадуліна, які быў у шпіталі, пытаўся пра ўсіх, каго ведаў. Я адчувала, што ён сьпяшаецца, бо малітва (намаз) у мусульманаў у пятніцу — асаблівая, і Яндарбіеў сказаў, што будзе маліцца за ўсіх сваіх новых сяброў у Беларусі. Я пажадала яму сьветлага дня.

Зянон

## На сьмерць Зелімхана Яндарбіева

Бацян адляцеў
На далёкі Каўказ.
Не дачакацца яму
вяртаньня.
І ўсё ж:
Ня будзем плакаць над магілай.
Ня мусіць бачыць нашых сьлёз
Маскаль, у рабстве спавіваны.
Ня будзем плакаць над магілай,
Салдат ня вечны на вайне.
Ацэняць толькі перамогу
І сьветлы дзень,
І вольны край.
Хай злая роспач нас міне.
І ўсё ж:
Як цяжка ведаць, калі гіне
Паэт вялікі на вайне.
Ня будзем плакаць над магілай.
Як Бог магутны — дух жыве.
І ўстане зорны час над намі —
Свабода ў нашай старане.

*15 лютага 2004*
*Варшава*

# 80-гадовы дыктатар



## Робэрт Мугабэ

**Прэзыдэнт Зымбабвэ Робэрт Габрыэль Мугабэ — аднагодак Васіля Быкава. Сёлета 21 лютага ён адзначыць 80-годзьдзе. Афрыканскім палітыкам такія гады — не мяжа. Аднак, мабыць, Мугабэ невясёла. Хто ведае, ці не далучыць Амэрыка і яго рэжым да восі зла. Між тым, калісьці імя Мугабэ стаяла ў адным шэрагу зь імем Нэльсана Мандэлы і сам Буш-старэйшы называў Зымбабвэ ўзорам для ўсяго рэгіёну. Цяпер Мугабэ параўноўваюць з Гітлерам, Пол Потам і... Лукашэнкам. Як адбылася такая мэтамарфоза? І хто ж ён, афрыканскі калега «бацькі»?**

**Біяграфія Мугабэ — вельмі тыповая: вучань, а потым настаўнік у вясковай каталіцкай школе. У пошуках новых ведаў ён кіруецца ў Паўднёвую Афрыку, затым у Англію. Вынікам сталі званьні бакаляўра гістарычных і эканамічных навук. Пасьля, у часы зьняволеньня за нелегальную дзейнасьць, экстэрнам былі набытыя яшчэ тры вышэйшыя адукацыі, у тым ліку магістарская па філязофіі. Вярнуўшыся на радзіму, саракагадовы спэцыяліст застае яе ў стане зацяжной канфрантацыі.**

### Як Радзівіліха Родза ашукала

Вытокі яе сягаюць у 1870 г., калі на паўднёвае ўзьбярэжжа Афрыкі сышоў Джордж Сэсыл Родз. Гэты сямнаццацігадовы хворы на астму юнак быў апантаны вялікай місіяй — стварыць сусьветную брытанскую імпэрыю. Пачатковы капітал для пастаўленай мэты меўся, энэргіі было аж замнога, і хутка Родз сапраўды пачаў дадаваць новыя правінцыі да ўладаньняў яе вялікасьці, не забываючы і сябе. Так на мапе зьявіліся Радэзіі Паўднёвая і Паўночная, брытанская калёнія Ньясаленд (цяпер адпаведна Зымбабвэ, Замбія, Малаві) і інш. Легенды хадзілі пра багацьце некаранаванага караля Паўднёвай Афрыкі. І многія на яго квапіліся. Так, аднойчы да Родза завітала пані Кацярына Радзівіл (народжаная Ржавуцкая) — сьвякроўка славутай фундатаркі першай «Нашай Нівы» Марыі Магдалены. Жанчынаў Родз не любіў, але перад імем Радзівіл самлеў і прыняў тытулаваную наведніцу. Да таго ж княгіня ня дрэнна пісала і прапаноўвала Родзу свае паслугі ў якасьці прапагандысткі яго плянаў. Але хутка Родзу давялося моцна шкадаваць. Калі ён адмовіўся аплачваць праекты княгіні, яна папросту падрабіла подпіс на вэксалях. На грошы мільянэра Кацярына выдала шэраг сэнсацыйных кніг аб жыцьці эўрапейскага бамонду, у тым ліку дзьве аб расейскай «распуцінщчыне». Родза ж гэтыя скандалы ды застарэлая астма выправілі на той сьвет.

Месцам вечнага спачыну Родз сам абраў Паўднёвую Радэзію. Яна была яго ўлюбёным стварэньнем. Ёй адводзілася роля краіны белага чалавека ў Афрыцы.

### Радэзійскі крызыс

Апошняму былі створаны ўсе ўмовы для бесклапотнага заможнага жыцьця за кошт тубыльцаў. Казалі, што жыцьцё белага ў Радэзіі ідзе паводле прынцыпу 1-2-3. Адна машына, два басэйны, трое слугаў. У руках белых, што складалі каля 5% насельніцтва, было сканцэнтравана 70% зямельнага фонду краіны. Белыя лічылі такі стан натуральным і вечным. Аднак часы зьмяніліся. Баючыся канчатковa страціць імпэрыю, Лёндан вырашыў крыху рэфармаваць Радэзію, пашырыўшы правы чарнаскурых. У параўнаньні з Паўднёвай Афрыкай і ЗША міжрасавыя адносіны выглядалі тут больш талерантнымі: чорных і белых нават можна было бачыць у адной чарзе. Аднак за гады дэкалянізацыі ў Радэзіі апынулася досыць шмат белых уцекачоў з суседніх краін — як у нас расейскамоўных з Прыбалтыкі. Страціўшы ўсё, злыя на тубыльцаў і на мэтраполію, што не бараніла і не чакала іх, яны марылі захаваць імпэрыю хоць у мініятуры. Пра тое ж марылі й мясцовыя белыя вайскоўцы, адным зь якіх быў былы лётчык Ян Сьміт. Абапіраючыся на падтрымку Прэторыі, ён зьдзяйсьняе пераварот і абвяшчае стварэньне незалежнай «белай» дзяржавы — Рэспублікі Радэзіі.

Так пачаўся знакаміты «радэзійскі крызыс» (1965—1980), у які былі ўцягнутыя нават Генры Кісынджэр ды Маргарэт Тэтчэр. Партыі чарнаскурых былі забароненыя, а лідэры трапілі ў канцлягеры. Свабоду, а то й жыцьцё можна было страціць за парушэньне камэндацкай гадзіны, ужываньне сымболікі апазыцыйных партый і руху. Апошняе было кляcыфікавана міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі як праява фашызму. Чорныя перайшлі да партызанскіх дзеяньняў. Мугабэ адразу апынуўся ў ліку лідэраў супраціву. Прагматызм, арганізатарскія здольнасьці і прыналежнасьць да шона — самага вялікага народу ў краіне — дапамаглі яму хутка стаць прызнаным кіраўніком.



Ян Сьміт

### Чорна-белая ідылія

Між тым становішча белага ўраду рабілася ўсё больш незайздросным. Ніводная дзяржава ў сьвеце яго не прызнавала, ваеннае вырашэньне канфлікту не вымалёўвалася, стварэньне кабінэту з памяркоўных чорных дзеячоў на чале зь біскупам Музарэвам таксама не дало вынікаў. Урэшце лідэр белых Ян Сьміт вымушаны быў даць згоду на ўдзел партызанаў у выбарах. Так Радэзія стала Зымбабвэ — дзяржавай чорных афрыканцаў. Да яе была цяпер прыкаваная ўвага ўсяго сьвету: ад таго, ці здолеюць белыя і чорныя быць разам у новай рэспубліцы, залежаў лёс апартэіду ў ПАР, вырашэньне пытаньня аб незалежнасьці Намібіі.

Першыя крокі новага ўраду пераўзышлі самыя аптымістычныя прагнозы. Так, былы кіраўнік расісцкага рэжыму Я.Сьміт атрымаў ад новай улады ня кулю ў патыліцу і нават не выгнаньне, а пэнсію. Белых заклікаюць заставацца і працаваць для Радзімы, ім гарантуюць поўную бясьпеку і захаваньне маёмасьці. Так удалося пазьбегнуць развалу эканомікі і працягу грамадзянскай вайны. Дзеля гэтага Мугабэ дараваў і сяброўства з Кім Ір Сэнам, і зацісканьне апазыцыі, і жорсткую расправу з былымі паплечнікамі ндэбэле (другі чорны народ Зымбабвэ), незадаволенымі перавагай шона ва ўладзе.

Адносна мяккая палітыка ў дачыненьні да белых тлумачылася традыцыйна моцнымі сувязямі з ПАР, дзе ва ўладзе яшчэ стаялі іх суродзічы. З прыходам у Прэторыю чорных становішча зьмянілася. Цяпер рэжым Мугабэ страціў замежнага ворага, дый апазыцыю ўжо немагчыма было абвінаваціць у сувязях з расістамі. Затое эканамічная сытуацыя ўсё пагаршалася: інфляцыя дасягнула 100%, вырасла беспрацоўе.

На парлямэнцкіх выбарах 1999 г. перамог апазыцыйны «Рух за дэмакратычныя зьмены» на чале з Морганам Цвангараі — мясцовым прафсаюзным лідэрам. Рэфэрэндум аб зьменах у канстытуцыю скончыўся паразай для ўлады.

### Народ з «чыфам»

Урад абвінаваціў белых фэрмэраў у фінансаваньні апазыцыі і абвясьціў пра экспрапрыяцыю іх маёмасьці. У гэтым не было нічога прынцыпова новага. І раней адбываўся захоп земляў белых фэрмэраў, толькі цяпер гэта атрымала афіцыйную санкцыю.

ЗША і Вялікабрытанія асудзілі дзеяньні ўраду Мугабэ. Пад іх націскам яго сябрам (як і афіцыйным асобам Беларусі, М'янмы) быў забаронены ўезд у краіны ЭЗ. Сам прэзыдэнт Зымбабвэ называе свае дзеяньні вяртаньнем нарабаванага і вінаваціць сваіх крытыкаў у расізьме й фарысэйстве. І сапраўды, хіба ня тое самае было зроблена ў Альжыры з двума мільёнамі французскіх каляністаў або ў Анголе і Мазамбіку, дзе партугальцы жылі з часоў Васка да Гамы? Усіх іх зьмёў вецер антыкаляніялізму. Чаму ў Зымбабвэ павінна быць інакш? І большасьць зымбабвійцаў, асабліва вяскоўцаў, на баку свайго лідэра. Хрысьціянскае вучэньне аб дараваньні ворагу сярод іх не прыжылося, а вера ў містычную сувязь з продкамі жыве. У Зымбабвэ 60% насельніцтва вызнае традыцыйную рэлігію (найбольшая лічба для рэгіёну).

Таму вяртаньне зямлі, аднятай белымі, для іх ня толькі сродак палепшыць свой дабрабыт, але і магчымасьць наладзіць сувязь з продкамі. Супраць такога можа быць толькі яўны адшчапенец.

На баку Мугабэ таксама вайскоўцы. З прэзыдэнтам іх, акрамя вэтэранскіх успамінаў, зьвязвае прывілеяванае становішча. А беспрацоўныя вэтэраны вызваленчай вайны ці тыя, хто выдае сябе за іх, тым часам распраўляюцца зь белымі фэрмэрамі, іх чорнымі парабкамі, а заадно і з тымі, што крытыкуюць «чыфа» (правадыра) вызваленчай вайны.

Нэўтральную пазыцыю занялі ў адносінах да рэжыму Мугабэ суседзі — Мазамбік, Батсвана і, самае галоўнае, Паўднёвая Афрыка. Прэзыдэнтам гэтых краінаў даводзіцца лічыцца са сваім электаратам, што абагаўляе зымбабвійскага «Робіна Гуда». Таму Мугабэ ня варта хвалявацца, пакуль чорных ня лаюць яго.

**Усяслаў Шатэрнік**



Кацярына Радзівіл



Джордж Сэсыл Родз

# Роднае слова грыўну беражэ

**Выданьні на ўкраінскай мове атрымалі ва Ўкраіне падатковыя льготы.**

У дзяржбюджэце асобным артыкулам прапісаныя выдаткі на падтрымку ўкраінскай мовы. На гэтую пачэсную мэту сёлета пойдзе рэкордная сума — 150 млн грыўнаў (28 млн даляраў). І гэта яшчэ ня ўсё. Сёлета прыняты «малы Падатковы кодэкс» — закон «Аб унясеньні зьменаў у некаторыя заканадаўчыя акты Ўкраіны ў сувязі з прыняцьцем Закону «Аб дзяржаўным бюджэце Ўкраіны на 2004 г.». Паводле новага закону, падаткам на дададную вартасьць будуць абкладаць усе апэрацыі продажу і дастаўкі прэсы, а таксама кніжны гандаль. Выключэньне зрабілі толькі для выданьняў на дзяржаўнай — украінскай мове.

ПДВ ва Ўкраіне сёлета роўны 20%, у 2005 г. — 17%, у 2006 г. ён зьнізіцца да 15%. Летась у якасьці экспэрымэнту падаткам абклалі ўсіх украінскіх кнігавыдаўцоў. У выніку на паліцы трапіла толькі 9,5 тыс. кнігаў (у 2002 г. — 12,5 тыс.). Агульны наклад выданьняў зьменшыўся амаль удвая — з 47 862 тыс. асобнікаў у 2002 г. да 28832 тыс. летась. У роспачы пісьменьнікі ды выдаўцы расклалі 4 лютага вогнішча з макетаў нявыдадзеных кніг пад вокнамі Кабінэту Міністраў ды падсмажылі на ім шашлык для ўрадоўцаў. Уражаны акцыяй, Мінфін паабяцаў дамагчыся зьменаў у падатковым заканадаўстве. Не падмануў, але й ня даў выдаўцам схітраваць — ільготы па ПДВ увялі толькі для кніжак на ўкраінскай мове. Тыя, хто лічыць друк на расейскай больш пэрспэктыўным, мусяць уносіць у бізнэс-плян дадатковыя 20% на падатак.

Тое самае тычыцца і прэсы. Газэты ды часопісы, што выходзяць не па-ўкраінску, у шоку. Рэдактары ды выдаўцы 139 выданьняў напісалі адкрыты ліст Кучму з просьбай выправіць «фатальную памылку». Ільготы павінны мець «усе без выключэньня айчынныя выданьні», лічаць яны. Праўда, самыя значныя падпісанты — 65 выданьняў з калекцыі «Бурда-Украïна» ды набор «Комсомолка-АиФ-Известия» ад ЗАТ «Український Медіа Холдінг» — украінскія не па зьмесьце, а хіба па месцы выдачы рэгістрацыйнага пасьведчаньня.

З аднаго боку, «малы Падатковы кодэкс» свабодзе прэсы не спрыяе, бо ставіць частку выданьняў у больш выгадных умовах. Найбольш крыўдна дробным газэтам, якія выходзяць на мовах меншасьцяў: румынскім ды крымска-татарскім. Зь іншага боку, ільготы па ПДВ — эфэктыўная мера падтрымкі ўкраінскамоўнае прэсы, што знаходзіцца ў стане няроўнае канурэнцыі з расейскамоўнаю, і сплата гістарычнага доўгу перад украінскай культурай.

**Алесь Кудрыцкі**

# Герой і здраднік

## Памёр Рышард Куклінскі, самы карысны шпег ЦРУ ў сацыялістычным лягеры

**За некалькі дзён да сьмерці шпега выйшла кніга журналіста Бэнджаміна Вайзэра, якая называе Куклінскага найважнейшым шпіёнам ЦРУ. Яна раскрывае некаторыя таямніцы польскага палкоўніка, у 1981 годзе сакрэтна вывезенага ў ЗША. Аўтар, які яшчэ ў 1992 г. раскрыў прозьвішча Куклінскага, нарэшце атрымаў дазвол на карыстаньне засакрэчанымі дакладамі ЦРУ 70-х і 80-х. Кніга пад назвай «Таемнае жыцьцё» зьмяшчае і невядомыя раней успаміны афіцэраў ЦРУ. Куклінскі, палкоўнік Генштабу Народнага Войска Польскага, у 1971—81 г. перадаў амэрыканцам 40 тысяч старонак дакумэнтаў, пераважна па-расейску, у тым ліку стратэгічныя пляны Масквы й мапы разьмяшчэньня засакрэчаных камандных пунктаў Войска Польскага і Савецкай Арміі.**



WWW.VIDEOFACT.COM

### Тысячы старонак

Сам палкоўнік Куклінскі цьвердзіў, што супрацоўнічаць з амэрыканскай выведкай пачаў з уласнай ініцыятывы, пад уплывам уварваньня войскаў Варшаўскае дамовы (у тым ліку польскіх) у Чэхаславаччыну, хоць у плянаваньні яго браў актыўны ўдзел. Канчаткова ж рашыўся на гэты крок ён пасьля расстрэлу рабочых у Гданьску ў сьнежні 1970 г. Супрацоўніцтва завязаў праз вайсковага аташэ ЗША ў Нямеччыне ў часе турпаездкі па беразе Балтыкі. Крытыкі палкоўніка гэтую вэрсію абвяргаюць і мяркуюць, што ЦРУ завэрбавала яго, прычым адбылося гэта падчас ягонай працы ў Віетнаме.

Так ці інакш «Мэва», як яго называлі ў дакумэнтах ЦРУ, перадаў амэрыканцам у суме 40 265 старонак дакумэнтаў і аналітычных матэрыялаў. На іх аснове было складзена 2,6 тыс. дакладаў для прэзыдэнта, дзяржсакратара, міністра абароны, шэфа Камітэту начальнікаў штабоў ЗША і іншых высокіх чыноўнікаў.

У 1978 г. афіцэр ЦРУ, які аналізаваў працы «Мэвы», пісаў дырэктару Ўпраўленьня: «Гэта найважнейшая крыніца з усіх, якія ЦРУ калі-небудзь мела ня толькі ў Польшчы, але і ва ўсім сацыялістычным лягеры». Калі адзін з маладых афіцэраў ЦРУ ад'яжджаў «на працу» ў Варшаву, ягоны калега, які ведаў Куклінскага, сказаў: «Там ты можаш за адну сустрэчу з агентам убачыць больш дакумэнтаў, чым за ўсю рэшту сваёй кар'еры».

ЦРУ лічыла Куклінскага сваёй найлепшай крыніцай інфармацыі пра Варшаўскі блёк. Кніга Вайзэра ўпершыню дае ўяўленьне, якога кшталту матэрыялы Куклінскі перадаваў амэрыканцам. Большасьць зь іх палкоўнік, які працаваў у кіраўніцтве Генштабу і меўся, на думку многіх, заняць у будучыні пасаду яго начальніка, фатаграфаваў. Куклінскі перадаваў таксама шмат уласных аналізаў настрояў у Генштабе.

Сярод найбольш высока ацэненых ЦРУ дакумэнтаў былі:

1) інжынэрная дакумэнтацыя «Пляну «Альбатрос» — будаўніцтва на тэрыторыі СССР, Баўгарыі і Польшчы трох бункераў Варшаўскага блёку, якія павінны былі служыць перадавымі каманднымі пунктамі ў выпадку вайны з NATO. Працаваць у іх меліся толькі савецкія афіцэры. Польскі бункер павінен быў знаходзіцца пад Легніцай, і яго будаўніцтва трымалася ў такой таямніцы, што галоўнакамандуючы Варшаўскага блёку маршал Віктар Кулікоў пыражджаў агледзець аб'ект у цывільным. На падставе гэтых дакумэнтаў Пэнтагон — а там цэлы спэцаддзел займаўся аналізам дакладаў Куклінскага — падрыхтаваў плян бамбардаваньня бункераў у выпадку савецкай атакі;

2) аналіз тэхналягічных навінак у войсках Варшаўскага блёку за 1977 г. Гэты дакумэнт прагназаваў, якое новае ўзбраеньне ўвойдзе ва ўжытак у сацлягеры за бліжэйшыя восем гадоў. ЦРУ прызнала гэты аналіз «найважнейшым вайсковым дакумэнтам, які калі-небудзь трапляў у нашы рукі з-за жалезнай заслоны»;

3) плян перадачы Маскве камандаваньня войскамі краін Варшаўскае дамовы ў выпадку вайны з NATO. Куклінскі, які браў удзел у абмеркаваньні дакумэнту, пісаў у ЦРУ, што польскі Генштаб працівіўся перадачы расейцам кантролю над арміяй. Палякам асабліва не падабаўся плян перамяшчэньня ў выпадку вайны польскай проціпаветранай абароны ў ГДР з мэтай забесьпячэньня прасоўваньня савецкіх войскаў на захад. Гэта азначала, што Польшча рабілася б цалкам безабароннай перад авіяналётамі NATO. Начальнік Генштабу польскай арміі генэрал Флярыян Сівіцкі на перамовах у Маскве адмовіўся падпісваць гэты пункт дакумэнту. Тады маршал Кулікоў у прысутнасьці польскіх афіцэраў патэлефанаваў у Варшаву генэралу Войцеху Ярузэльскаму, які пасьля кароткай размовы згадзіўся на расейскія прапановы;

4) схема арганізацыі войскаў Варшаўскага блёку ў выпадку вайны — сьпіс часьцей, іх разьмяшчэньне, структуры кіраваньня, сувязі і забесьпячэньня ўсім неабходным для пасьпяховага вядзеньня вайны;

5) справаздача з таемнай штабной гульні, якая адбылася ў Варшаве ў лютым 1981 г. Афіцэры, што падпісалі пункт аб нераскрыцьці таямніцы, адпрацоўвалі розныя варыянты ўвядзеньня ваеннага становішча. Найлепшы варыянт і быў ужыты 13 сьнежня; амэрыканцы мелі пляны ўводу войскаў, узяцьця пад кантроль тэлебачаньня і нават эскізы друкаваных употай у СССР абвестак аб увядзеньні ваеннага становішча, але не папярэдзілі аб гэтым лідэраў «Салідарнасьці» і касьцёлу — гэта ў 1984-м на адной з прэс-канфэрэнцый выкажа тадышні легендарны прэс-аташэ ўраду Ежы Урбан;

6) тэкст выступу генэрала Ярузэльскага перад кіраўніцтвам Мінабароны ў чэрвені 1981 г., дзе Ярузэльскі перасьцерагаў: «Калі самі ня вырашым праблемы, расейцы ўвойдуць у Польшчу, што скончыцца немінучай грамадзянскай вайной і велізарным праліцьцём крыві». Ярузэльскі вычарпаны фізычна і маральна, пісаў Куклінскі, ён выкурвае па 40 цыгарэтаў за дзень і прымае полівітаміны, каб утрымацца на нагах;

7) дэталёвыя тэхнічныя дадзеныя і даклады аб выпрабаваньнях разнастайных сродкаў узбраеньня, у тым ліку танка Т-72 і ракетнай устаноўкі «Страла-1»;

8) даклад пра стварэньне Савецкім Саюзам мабільных вайсковых групаў, якія павінны былі адыграць ключавую ролю падчас атакі на Заходнюю Эўропу;

9) зьвесткі аб разьмяшчэньні савецкіх базаў проціпаветранай абароны ў Польшчы і ГДР, а таксама даклад пра найлепшыя мэтады маскіроўкі вайсковага абсталяваньня ад амэрыканскіх спадарожнікаў.

### Савецкія дэсантнікі

У сваіх дакладах за 1980—81 г. Куклінскі быў перакананы ў няўхільнасьці савецкай інтэрвэнцыі. Афіцэры штабу ў прыватных гутарках згадвалі, сярод іншага, пра савецкіх дэсантнікаў, якія ўпотай прызямляліся ў розных частках Польшчы, каб падрыхтаваць аэрадромы і базы для хуткага наступленьня савецкага войска.

Генштаб дазнаўся пра гэтыя дэсанты, калі адной з такіх груп не хапіла харчаваньня і згаладалыя салдаты пакінулі схованку ў лесе, просячы дапамогі ў польскіх казармах, што знаходзіліся непадалёк. Расейцы дэсантавалі ў розных пунктах Польшчы васямнаццаць такіх групаў — кожная па восем салдатаў.

Польскія афіцэры былі адхіленыя ад падрыхтоўкі да вялікіх вучэньняў «Саюз-81», пад выглядам якіх — у гэтым быў перакананы ўвесь Генштаб — расейцы рыхтавалі інтэрвэнцыю ў Польшчу. Штаб вучэньняў быў разьмешчаны ў Вюнсдорфе ў ГДР, а штабныя нарады адбываліся ў два прыёмы — без палякаў і зь імі.

У красавіку 1981 г. Куклінскі паведамляў пра шматлікія палёты савецкіх шрубалётаў над Польшчай. Маршруты не былі ўзгодненыя з польскім бокам і непакоілі Генштаб. Калі палякі запатрабавалі тлумачэньняў, яны пачулі, што верталёты перавозяць харчаваньне. Толькі за адзін дзень 25 красавіка расейцы зьдзейсьнілі 280 такіх палётаў з СССР у Польшчу і назад, а таксама паміж савецкімі базамі на тэрыторыі ПНР.

У жніўні маршал Кулікоў запатрабаваў ад Ярузэльскага ўвесьці ў польскае войска савецкіх дарадцаў — на ўзроўні ад Генштабу да асобных часьцей. Просьба была адхіленая, Кулікоў «выйшаў ад нас, бразнуўшы дзьвярыма»...

Бэнджамін Вайзэр сьцьвярджае, што Куклінскі ўцёк з Польшчы літаральна ў апошні момант, калі над ім навісла пагроза правалу. Праз сваіх шпіёнаў у ЗША расейцы ведалі, што нехта перадае таямніцы Варшаўскага блёку, і напружана шукалі крыніцу ўцечкі. У 1978-м увагу адцягнулі ўцёкі начальніка вайсковай разьведкі Румыніі, а праз тры гады — уцёкі ў ЗША намесьніка начальніка вайсковай выведкі ПНР генэрала Ўладзіслава Асташэвіча, які ў Варшаве быў суседам Куклінскага.

### Уцёкі ў скрыні

Увечары 7 лістапада 1981 г. амэрыканскі дыпламат падабраў яго на вуліцы і завёз разам з жонкай і дваімі дзецьмі ў амэрыканскае пасольства. Там Куклінскі пасадзілі ў кардонную скрыню і ў фургоне пасольства вывезьлі ў Заходні Бэрлін. А ўжо адтуль яны паляцелі ў ЗША.

У ЗША Куклінскі разам зь сям'ёй пасяліўся пад Вашынгтонам пад зьмененым прозьвішчам. Ён адгадаваў бараду і вусы, зрабіў невялікую пластычную апэрацыю, мэдыкі таксама выдалілі яму надпіс «Атлянтык», вытатуяваны ў маладосьці на плячы. У 1983 г. падчас паездкі ў Румынію ўцякла нявеста аднаго з сыноў Куклінскага. Гэта была сплянаваная апэрацыя — дзяўчына адразу трапіла ў ЗША, дзе выйшла замуж за Куклінскага-малодшага. Пасьля ўцёкаў Куклінскі працаваў на ЦРУ аналітыкам, неаднойчы мяняў месцы жыхарства, калі зьяўлялася найменшая падазрэньне. Тым часам вайсковы суд у Польшчы ў 1984 г. завочна прысудзіў палкоўніка да сьмяротнага пакараньня за здраду радзіме. Прысуд гэты будзе канчаткова адменены толькі ў 1997-м. У 1998-м Куклінскі пабывае на айчыне і нават стане ганаровым грамадзянінам Кракава.

Абодва сыны палкоўніка таямніча загінуць у 1994 г. у прамежку некалькіх месяцаў: адзін — падчас падводнага плаваньня ля ўзьбярэжжа Флорыды, другі — пад коламі невядомае машыны. Сябры Куклінскага ўпэўненыя, што за гэтымі сьмерцямі стаялі расейскія спэцслужбы, але ЦРУ не знайшло доказаў наўмыснасьці ў гэтых здарэньнях.

**Франц Субель; «Gazeta Wyborcza»**

### Падзеленая нацыя

Палякі па-рознаму ставяцца да сваёй ПНРаўскай гісторыі. Сацыялягічнае дасьледаваньне, праведзенае на замову часопісу «Wprost», выявіла: 36% лічаць Куклінскага здраднікам, 34% — героем, 30% ня маюць свайго меркаваньня ў гэтай справе.

Зьбігнеў Бжазінскі і Ян Новак-Езяранскі ўважаюць Куклінскага «першым афіцэрам Польшчы ў NATO». Сам Куклінскі настойваў, што працаваў на амэрыканцаў не дзеля грошай. А вось Лех Валэнса ў свой час назваў паміласаваньне палкоўніка Куклінскага «палітычнай гульнёй камуністаў». Валэнса быў супраць рэабілітацыі Куклінскага: «Палкоўнік, які парушыў вайсковую прысягу, ня можа быць добрым прыкладам». Затое, як ні парадаксальна, прыхільнікамі рэабілітацыі былі прэзыдэнт Квасьнеўскі і асабліва прэм'ер Мілер, экс-камуністы.

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

**Міністар інфармацыі Ўладзімер Русакевіч 11 лютага падпісаў загад аб прыпыненьні на тры месяцы выхаду незалежнай газэты «Вечерний Столин»**. Падставы: газэта «зьмяніла тэматыку» (заміж адпачынкавай і вытворча-практычнай стала масава-палітычнай) і перайшла зь дзьвюхмоўя толькі на расейскую, не паведаміўшы пра гэта ў Мінінфармацыі. Карэспандэнта газэты «День» **Анджэя Пісальніка** і карэспандэнтку «Белорусской газеты» **Ірыну Чарняўку** 13 лютага з дапамогай міліцыі выдалілі з нарады ўпраўленьня інфармацыі Гарадзенскага аблвыканкаму, дзе абмяркоўваўся плян ідэалягічных мерапрыемстваў на 2004 год. Карэспандэнтка «Белорусской деловой газеты» па Гомельскай вобласьці **Ірына Макавецкая** 13 лютага атрымала папярэджаньне ад пракурора вобласьці Алега Палавінкі. Яна апублікавала «матэрыялы судовай справы безь пісьмовага дазволу судзьдзі і паставіла пад сумнеў яго незалежнасьць і законнасьць прынятага рашэньня». 14 лютага, на дзень сьвятога Валянціна, перад пачаткам маладафронтаўскай акцыі-сьвяткаваньня былі затрыманыя **Павал Севярынец, Барыс Гарэцкі, Юлія Сіповіч, Арцём Ліцьвінаў, Андрэй Шыбко, Алесь Васілеўскі**. Іх завезьлі ў Цэнтральны РУУС «для вызначэньня асобаў», хоць перад затрыманьнем адзін зь міліцыянтаў сказаў: «Во! Севярынец зьявіўся!» 17 лютага падчас распаўсюду ўлётак у Менску былі затрыманыя **Любоў Кучынская** і **Аляксей Контар** — актывісты незарэгістраванага «Зубра»: іх пратрымалі 1 гадзіну ў Партызанскім РУУС і адпусьцілі без складаньня пратаколу. Суд Ленінскага раёну Менску 18 лютага часткова задаволіў пазоў Сяргея Атрошчанкі да **«Народнай волі»**: не пагадзіўся на матэрыяльную кампэнсацыю, але прымусіў газэту надрукаваць абвяржэньне. Пазоў тычыўся інтэрвію з старшынём Саюзу габрэйскіх арганізацыяў і грамадаў Беларусі **Леанідам Левіным**, які назваў «бандыцкім учынкам» інтэрвію зь ім, што надрукавала газэта Атрошчанкі «Обозреватель». Левіну ў тым інтэрвію прыпісалі, нібы ён назваў дэпутатаў Фралова й Навасяда антысэмітамі. Галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч і сам Левін лічаць прысуд несправядлівым і маюць падаваць касацыйную скаргу.

**АШ**




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Беларусь рыхтуецца да прарыву ў космас. За няпоўныя два гады навукоўцы мусяць распрацаваць і выпрабаваць унікальную апаратуру. Гэта ня толькі бізнэс-праект альбо новая нацыянальная ідэя, якую так актыўна шукае кіраўніцтва краіны. Гэта найперш важнае палітычнае мерапрыемства. У 2006-м пройдуць выбары прэзыдэнта, і адзін з кандыдатаў зьбіраецца прыйсьці першым да фінішу на нацыянальным касьмічным спадарожніку.

# У неба на «Сатане»

## Беларуская касьмічная праграма

Сума, у якую абыдзецца Беларусі касьмічны праект, не афішуецца. Зь неафіцыйных крыніцаў вядома пра 8—10 млн даляраў, якія пляנуе ўкласьці беларуская дзяржава. Фактычна сродкаў можа спатрэбіцца больш. Толькі вывад на арбіту аднаго кілаграма грузу сёньня каштуе каля 20 тыс. даляраў. Раней, калі спадарожнікі важылі каля 10 тонаў, а тэрмін іх «жыцьця» не перавышаў трох гадоў, такую дарагую цацку маглі дазволіць сабе толькі супэрдзяржавы. Цяпер у сьвеце поўным ходам ідзе працэс стварэньня міні- і мікраспадарожнікаў, якія могуць важыць 40—200 кілаграмаў і функцыянаваць ня менш за пяць гадоў. У найбліжэйшыя два гады Беларусь пляנуе запусьціць у космас такі мікраспадарожнік, вагой у некалькі сотняў кілаграмаў.

### Корпус расейскі, начыньне нашае

Канкрэтныя яго парамэтры стануць вядомыя ў сакавіку. 20 лютага расейская ракетна-касьмічная кампанія «Энэргія», сумесна зь якой беларускія навукоўцы працуюць над спадарожнікам, мае абараніць эскізны праект. У сакавіку плянуецца комплексная абарона, дзе будуць «вызначаныя асноўныя тэхнічныя рашэньні».

Корпус спадарожніка, плятформу, сыстэмы сувязі, навігацыі, арыентацыі, запуску і сам запуск забясьпечвае расейскі бок. Беларускае будзе начыньне. Оптыка-электронны блёк спадарожніка, які забясьпечвае прыём інфармацыі й здымкі зямной паверхні, вырабіць беларускае ААТ «Пеленг». Раней яно ўваходзіла ў БелОМА (Беларускае оптыка-мэханічнае аб'яднаньне), і яго прадукцыя выдатна зарэкамэндавала сябе на савецкіх касьмічных апаратах. Каціруецца яна на сусьветным рынку і сёньня: у сьнежні 2003 г. Кітай запусьціў спадарожнік зь пеленгаўскай оптыкай. На прасторы былога СССР «Пеленг» мае толькі аднаго канкурэнта — завод у Краснагорску, у Расеі.

Удзельнікі праекту скардзяцца, што беларускае заканадаўства не прыстасаванае да міжнародных кантрактаў па інфармацыйных тэхналёгіях, ня ўлічвае спэцыфікі выкананьня такіх навуковых работаў. Праз гэта даводзіцца рабіць шмат узгадненьняў, іншы раз — нават у Сідорскага. Такімі тонкасьцямі займаецца Рабочая група па кіраваньні праектам на чале з галоўным навуковым сакратаром НАН Сяргеем Жданком.

### Касьмічны піяр

Старт расейскай ракеты зь беларускім спадарожнікам запляנаваны на сьнежань 2005 г. Навукоўцы ж спадзяваліся, што будуць мець на распрацоўку хоць бы тры гады. Але на кіраўніцтва дзяржавы не паўзьдзейнічалі ніякія іх аргумэнты. Стварыць і выпрабаваць унікальную апаратуру давядзецца ў рэкордна кароткі тэрмін. Сьпешка тлумачыцца проста: спадарожнік трэба запусьціць да прэзыдэнцкіх выбараў. У 2006-м ён мае стацца тым, чым былі ў 2001-м новыя станцыі мэтро і чыгуначны вакзал.

Цікавасьць Аляксандра Лукашэнкі да касьмічнай тэматыкі прачнулася ў 2002 г. Падчас наведваньня ракетна-касьмічнае карпарацыі «Энэргія» ў падмаскоўным Каралёве ён заявіў, што беларус абавязкова паляціць у космас. Але гэта хіба пад выбары-2011. А пакуль тое, прэзыдэнт «асабіста курыруе» стварэньне спадарожніка.

Ужо ў пачатку 2003 г. на стале кіраўніка дзяржавы ляжала аналітычная запіска з Нацыянальнай акадэміі навук — абгрунтаваньне мэтазгоднасьці стварэньня спадарожніка. Рэзалюцыю дакумэнт атрымаў станоўчую, і працаўнікі праекту, якія лічылі, што для Беларусі спадарожнік — задарагая «цацка», замаўчалі.

І ў красавіку 2003 г. у Менску адбылася нарада беларускіх і расейскіх навукоўцаў з удзелам прэзыдэнта. Галоўнай тэмай быў сумесны праект стварэньня першага беларускага спадарожніка.

Цікава, што пошукам бяспройгрышных піяр-акцыяў, альбо «нацыянальнай ідэі» ў космасе, сёньня займаецца ня толькі беларускі прэзыдэнт. Джордж Буш у сваёй перадвыбарчай кампаніі таксама зьбіраецца актыўна выкарыстоўваць грандыёзную касьмічную праграму, заплянаваную на бліжэйшыя дзесяцігодзьдзі. Гэта і асваеньне Месяца, і палёт амэрыканцаў на Марс. Украінскую касьмічную праграму трымае пад кантролем Леанід Кучма. Сёлета ён ужо паабяцаў адправіць украінцаў на Месяц і на Марс, праўда, агаварыўся, што ня ўсіх. Калісьці Кучма ачольваў галоўнае канструктарскае бюро «Паўднёвае» ў Днепрапятроўску, якое якраз і займаецца нацыянальнай касьмічнай праграмай. Нават Уга Чавэс гаварыў пра вэнэсуэльскі спадарожнік: маўляў, сам у космас не палячу, а апазыцыю магу запусьціць.

### Кругом выгадны

Спадарожнік хутка акупіцца. Здымкі зямной паверхні, якія праз два гады пачнуць паступаць зь беларускага спадарожніка, павінны зэканоміць немалыя бюджэтныя сродкі. Цяпер адзін здымак з чужога спадарожніка каштуе нам ад 1500 да 5000 даляраў. А інфармацыя патрэбная пастаянна. Каб яе мець, неабходна штогод набываць ліцэнзію за 1,5 млн даляраў.

Наш спадарожнік будзе знаходзіцца на арбіце вышынёй каля 500 кілямэтраў. Сэанс сувязі зь ім мае адбывацца штодня з 11 да 12-й. Здымаць тэрыторыю Беларусі спадарожнік зможа тры дні запар, чацьверты выпадае праз траекторыю палёту. На добры толк, Беларусі патрэбная арбітальная групоўка спадарожнікаў, але цяпер гэта нерэальна. Навукоўцы бачаць выхад у кааперацыі і абмене інфармацыяй з замежнымі спадарожнікамі. Заманліва, што наш спадарожнік зможа рабіць здымкі любога пункта Зямлі.

«Сёньня ўвесь сьвет ідзе па шляху разьвіцьця інфармацыйных тэхналёгіяў, — кажа адзін з удзельнікаў праекту. — Інфармацыя зьяўляецца і таварам, і стратэгічнай сыравінай. І многія краіны сьвету вельмі актыўна ў гэтым кірунку працуюць, укладваюць вялікія сродкі. Разумеюць, што без інфарматызацыі, без інфармацыйных тэхналёгіяў сучаснае грамадзтва пабудаваць нельга. Гэта ня толькі сыход ад папяровых тэхналёгіяў, але і альтэрнатыўная крыніца атрыманьня інфармацыі».

### Карова на арбіце

Наш спадарожнік афіцыйна называецца «Беларускі касьмічны апарат». Нехта з расейскіх калегаў парадзіў назваць яго «БелКА». Спачатку гэта была працоўная вэрсія, але яна прыжылася — нічога лепшага так і не прыдумалі. Хоць Белкамі ў Беларусі найчасьцей называюць кароваў. Але яшчэ ёсьць час, каб прапанаваць для першага нацыянальнага спадарожніка лепшую назву.

Запуск беларускага спадарожніка будзе зьдзяйсьняць расейскі «Касматрас». На арбіту «БелКА» будзе выведзеная славутай стратэгічнай ракетай «Сатана». У мэтах эканоміі ракета-носьбіт «штурхне» адразу 6—7 спадарожнікаў, сярод іх і наш. Гэта скароціць Беларусі выдаткі на запуск у дзесяць разоў.

Падрыхтоўка да старту звычайна праводзіцца грунтоўная і можа расьцягнуцца на паўгоду. Тут маюць значэньне мэтэаўмовы, стан магнітнага поля Зямлі й атмасфэры. Запускаць спадарожнік пляנуюць з Байкануру, але і гэта будзе ўзгадняцца. «Сатана» яшчэ ніводнага разу не падвяла. Зрэшты, на выпадак аварыі беларускі касьмічны апарат застрахуюць. Так што ўсе страты кампэнсуюцца. Апроч, хіба, галоўнае: сапсаванага перадвыбарнага эфэкту.

**Алег Тачоны**

## Сяргей Залаты:
# У тым ліку і ваенныя задачы

**На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае дырэктар прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сыстэмы» Сяргей Залаты.**

**«НН»: Чаму праект атрымаўся беларуска-расейскі, а не беларуска-кітайскі, беларуска-амэрыканскі?**

**Сяргей Залатым:** Мы былі абмежаваныя тым, што хацелі абавязкова прыцягнуць да працы над гэтым праектам сваіх спэцыялістаў. А тыя ж кітайцы паставілі б умову, што будуць усё рабіць самі, ставіць на беларускі спадарожнік сваю апаратуру... І тым ня менш, мы рассылалі інфармацыйныя лісты ў Кітай, Украіну і Расею, бо яны маглі выставіць за працу цэны, якія былі б для нас «пад’ёмнымі». А адпраўляць запыт у ангельскія ці амэрыканскія фірмы было бессэнсоўна. Бо там цэны ў 2—3 разы вышэйшыя. Мы атрымалі афіцыйныя адказы. Па гэтым пытаньні працавала камісія, якая ўсё прааналізавала і зрабіла выбар на карысьць Расеі.

**«НН»: У Расеі найтаньней?**

**С.З.:** Нас задаволілі цэны, а па-другое, у супрацы з Расеяй ёсьць пэрспэктыва. Расея стварае сваю арбітальную групоўку спадарожнікаў, зь ёй мы можам дамовіцца на льготных умовах пра абмен інфармацыяй. Акрамя таго, вырашаецца прablема з цэнтрам кіраваньня спадарожнікам (ужо ёсьць дамова). Патрэбная інфраструктура па кіраваньні будзе каштаваць даражэй, чым сам спадарожнік, і яе ў Беларусі няма. Ствараць для аднаго спадарожніка — немэтазгодна. А цэнтар плянаваньня ў нас будзе свой.

**«НН»: Ці можа беларускі спадарожнік выкарыстоўвацца ў ваенных мэтах?**

**С.З.:** Сёньня любыя касьмічныя тэхналёгіі — гэта тэхналёгіі падвойнага прызначэньня. Калі згадаць вайну ў Югаславіі, апэрацыю ў Іраку, дык краінамі NATO падчас канфліктаў выкарыстоўвалася інфармацыя практычна з усіх касьмічных апаратаў. Беларускі спадарожнік будзе здольны выконваць і ваенныя задачы. Любая дзяржава не была б дзяржавай, каб не адстойвала сваіх інтарэсаў.

Але найперш спадарожнік будзе выкарыстоўвацца ў мірных мэтах. Напрыклад, сёньня ў Эўропе высыхаюць лясы. Паводле ацэнак Камітэту ляснох гаспадаркі, штогод ад гэтага Беларусь губляе некалькі мільёнаў даляраў. Працэс гэты пачынаецца зь верхавіны дрэва. І ў залежнасьці ад таго, у які момант вызначаныя тэрыторыі, што высыхаюць, можна плянаваць вырубку лесу. Пакуль для гэтых мэтаў выкарыстоўваюцца найперш самалётныя здымкі, але выдаткі на іх выходзяць вялікія. У Беларусі таксама існуе вялікая праблема абнаўленьня тапаграфічных картаў. Ва ўсім сьвеце дзеля гэтага выкарыстоўваецца касьмічная інфармацыя.

**«НН»: Як хутка акупіцца праект?**

**С.З.:** Тэрмін гарантыйнай эксплюатацыі спадарожніка складае пяць гадоў. За гэты час ён і павінен акупіцца.

**«НН»: І што далей? Ці будзе працягвацца беларуская касьмічная праграма?**

**С.З.:** Сёньня ствараецца беларуская касьмічная сыстэма дыстанцыйнага зандажу Зямлі. А спадарожнік зьяўляецца адным зь яе кампанэнтаў. Гэтая сыстэма будзе прымаць інфармацыю ня толькі з нашага спадарожніка. Ужо ў канцы году мы забясьпечваем шэраг спажыўцоў касьмічнай інфармацыяй з дастаткова вялікай колькасьці спадарожнікаў, напрыклад расейскага «Мэтэору» альбо амэрыканскіх «NOAA» і «TERRA».

Мы разглядаем саму праграму стварэньня беларускай касьмічнай сыстэмы як нейкую прыступку, на якую можна вывесьці беларускае грамадзтва, бо ў яе рамках плянуецца і адукацыйны блёк. Людзей трэба вучыць, ім трэба паказваць, як з гэтай інфармацыяй працаваць, як ёй можна карыстацца. Сёньня вельмі нямногія кіраўнікі, у тым ліку і высокага ўзроўню, уяўляюць сабе, што рабіць з касьмічнай інфармацыяй. Калі мы рыхтавалі праект і яшчэ распрацоўвалі канцэпцыю, расаслалі практычна ва ўсе міністэрствы і ведамствы рэспублікі прапанову паведаміць пра іх патрэбы ў інфармацыі з космасу. Пасьля гэтага тэлефанавалі людзі і пыталіся: «А што гэта такое?»

**Гутарыў Сяргей Ёрш**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


WWW.NASA.GOV

# Ці па кішэні Амэрыцы?

**Амэрыка ўзнаўляе найбольш амбітную за апошнія трыццаць гадоў праграму дасьледаваньня космасу. Найперш місія накіруецца на Месяц, а потым на Марс.**

Падрабязнасьці праграмы пакуль застаюцца таямніцай. Аднак супрацоўнікі амэрыканскага агенцтва дасьледаваньня космасу NASA ўжо паведамілі, што місія на Месяц паляціць недзе ў 2018 г. Падкрэсьліваецца, што палёт неабходны дзеля падрыхтоўкі да магчымай місіі на Марс. На Месяцы можна будзе выпрабаваць і адладзіць тэхналёгіі й абсталяваньне для палёту на Чырвоную плянэту. Яшчэ адзін пункт касьмічнае праграмы ЗША — заснаваньне сталай касьмічнай станцыі на Месяцы.

У 1961 г. Кенэдзі абвесьціў, што да канца дзесяцігодзьдзя амэрыканцы высадзяцца на Месяцы. 20 ліпеня 1969 г. туды прызямліўся Ніл Армстранг. Да сьнежня 1972 г. амэрыканцы наведвалі Месяц яшчэ пяць разоў.

Амэрыканская праграма была прыпыненая 1 лютага мінулага году, пасьля выбуху карабля «Калюмбія» й гібелі астранаўтаў. Ад таго часу NASA нікога не высылала ў касьмічную прастору. Многія кангрэсмэны, уражаныя катастрофамі «Калюмбіі» ды «Чэленджэра» і клопатамі Расеі ў фінансаваньні будаўніцтва станцыі, раяць ураду адмовіцца ад касьмічных амбіцыяў. Штогадовая бюджэтная камісія Кангрэсу абразала выдаткі для NASA, падкрэсьліваючы, што тыя грошы патрэбныя краіне, а касьмічныя дасьледаваньні каштуюць задорага.

**Руслан Равяка**

# Як Кавалёнак пераемніка шукаў

## Беларусы не былі ў космасе ўжо 23 гады

Пасьля рэалізацыі праекту нацыянальнага спадарожніка паўстане патрэба выправіць у космас беларуса. Ужо амаль чвэрць стагодзьдзя мы не дасягалі касьмічных вышыняў.

Першымі беларускімі касманаўтамі былі Пятро Клімук зь Берасьцейшчыны і Ўладзімер Кавалёнак з-пад Крупак. 23-гадовы лётчык Клімук быў залічаны ў атрад савецкіх касманаўтаў у 1965 г., праходзіў падрыхтоўку, але толькі ў 1973 г. зьдзейсьніў першы палёт. Усяго ў космасе пабываў тры разы, апошні раз — у 1978 г., калі на арбітальнай станцыі «Саюз-6» сустрэў... земляка Ўладзімера Кавалёнка. Для Кавалёнка гэта быў ужо другі палёт, а апошні раз ён паляцеў у 1981-м. Пасьля беларусаў у космасе не было.

Пятро Клімук 12 гадоў узначальваў Цэнтар падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына, але летась сышоў. Кажа, што рапарт напісаў сам — лічыць, што трэба саступаць месца маладзейшым. Цяпер працуе дарадцам у Расейскім авіяцыйна-касьмічным агенцтве. Але, што дзіўна, толькі ад карэспандэнта «НН» Клімук упершыню пачуў аб праекце стварэньня беларускага спадарожніка.

«Зь беларусаў на касманаўтаў цяпер ніхто не рыхтуецца, — гаворыць сп.Клімук. — Летась у Цэнтар падрыхтоўкі касманаўтаў нікога не набіралі, і сёлета сярод дзесяці адабраных хлопцаў няма


ЖЭЛЕЗНЯКОЎ АЛЯКСАНДАР

Пятро Клімук упершыню пачуў аб праекце стварэньня беларускага спадарожніка ад карэспандэнта «НН».

ніводнага беларуса, як, дарэчы, і ўкраінца. Затое ёсьць два казахі...» У чым прычына, ён ня ведае. Адзначае толькі пагаршэньне беларуска-расейскіх адносінаў у апошні час.

Яшчэ два гады таму сытуацыя з маладымі беларускімі касманаўтамі была больш аптымістычнай. Тады пра пэрспэктывы палёту ў космас беларуса казаў Аляксандар Лукашэнка. Відаць, ён на кагосьці альбо на штосьці разьлічваў. Магчыма, на Ўладзімера Кавалёнка, які ачольваў Вайскова-паветраную інжынэрную акадэмію імя Жукоўскага. Бо менавіта Кавалёнак надумаў паслаць беларуса ў космас. У пачатку 2002-га ў Маскве ён пра гэта гаварыў з Лукашэнкам, адбылася размова і з Уладзімерам Пуціным.

У красавіку 2002-га У.Кавалёнак распавядаў мне, што ў Вайскова-паветранай інжынэрнай акадэміі імя Жукоўскага навучаюцца больш за дзесяць беларускіх хлопцаў. «Сярод іх ёсьць курсанты, якія, магчыма, паспрабуюць сябе на касьмічным шляху», — аптымістычна казаў генэрал-палкоўнік. Але неўзабаве яго адправілі на пэнсію, і ён ужо ня мог апекавацца землякамі.

**Сяргей Ёрш**

# Піцер. Summary



WWW.SERZH.RU

**У Піцеры не разумеюць беларускае мовы, але перапытваюць і цікавяцца, адкуль мы.**

Горад знаходзіцца з Магілёвам на адным мэрыдыяне на адлегласьці 834 км на поўнач. Гэта другі горад Расеі паводле насельніцтва і першы горад па колькасьці беларусаў. Іх там каля 3%, значыць, 150 тыс. Пры ўезьдзе — надпіс: «Санкт-Петербург. Город-герой Ленинград». І гэта савецка-расейская дваістасьць тут усюды. Ня зносяць савецкіх помнікаў, на прыколе стаіць «Аўрора», і ходзіць па вуліцах маскарадны Пётар. Тут, дарэчы, тры культавыя асобы: Пётар, Ленін і Пуцін. Прадаюцца дыванкі з Пуціным у кімано, Ленін на майках годна трымае хвігу. А я набыў запалкі зь Пятром. Кумір расейскае імпэрыялістычнае моладзі спаліў мой Магілёў і спрычыніўся да выбуху ў Полацкай Сафіі.

У Піцеры шмат турыстаў, палова зь іх немцы, а чвэрць кітайцы. Тут самае глыбокае ў сьвеце мэтро — на эскалятары ехаць хвіліны чатыры. І вельмі бруднае й сьмярдзючае, з алькаголікамі і жуйкамі на лавах.

У Піцеры не разумеюць беларускае мовы, але перапытваюць і цікавяцца, адкуль мы. У Эрмітаж (пафранцуску — «месца для самоты») забаронена праносіць усялякую вадкасьць, каб псых які, крый Божа, не панішчыў карціны кіслатою. Зімовы палац быў пабудаваны на аснове праекту Нясьвіскага замку. У Піцеры можна сустрэць беларускія аўтобусы МАЗы, а некаторыя зь іх пераабсталяваныя пад грамадзкія прыбіральні. Уваход — 700 рублёў на нашыя.

Піцер — вялікі горад. І дваісты. Цудоўны і шакуючы. Прывабны і бруднаваты. Шкада вось толькі, што беларусаў там я так і не пабачыў.

**Павал Чумакоў, Пецярбург—Магілёў—Менск**

# Ліцэй: паўгоду ў падпольлі

**На дварэ месяц люты.** Насамрэч не такі ён ужо люты, ва ўсякім разе, параўноўваючы з нашым «лютым летам». Але ўсё прайшло, Ліцэй жыве. Мы засталіся разам і дажылі да гэтага месяца, пратрымаліся паўгоду ва ўмовах, цалкам накіраваных супраць нас. А гэта ўжо пра нешта кажа.




ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Падчас абароны, а пасьля — экстрэмальнай вучобы імя Ліцэю абрасло разнастайнымі эпітэтамі, накшталт «няскораныя», «героі», і так званы «ліцэйскі дух» стаў для многіх людзей прыкладам жыцьцёвай прынцыповасьці й мэтанакіраванасьці. Ліцэй надаў веры ў лепшую будучыню, і, упэўнены, назіраючы за мужнасьцю маладзёнаў, нават самы хранічны пэсыміст залічыў бы, што ня ўсё згублена.

Прайшло паўгоду. Паўгоду на вуліцы, якія зьмянілі Ліцэй назаўжды. Ліцэй стаў больш сур'ёзным: не зажылі шнары ад летняй барацьбы, не засохлі сьлёзы ад разьвітаньня зь некаторымі дзецьмі, не дадало гонару выгнаньне з будынку й вымушанае бадзяньне па горадзе бяз права нармальнага жыцьця — вось што зрабіла зь Ліцэем улада. Выкладнікі нэрвуюцца за навучэнцаў, моладзь перажывае па страчаным будынку й творчых магчымасьцях, бацькі — за лёс дзяцей. Уся гэта нэрвовасьць напружвае ліцэйскае жыцьцё, стасункі, дый ці магчыма адчуваць сябе лепей, калі з табой абыходзяцца, як з апошнім вулічным сабакам, пазбаўляючы дому, усяго настолькі роднага й блізкага.

Каб любіць Беларусь і паважаць свой народ, неабавязкова вучыцца ў Ліцэі, слухаць лекцыі па літаратуры Лявона Баршчэўскага, дастаткова верыць, быць упэўненым у сабе й не спыняцца на дасягнутым. Ліцэісты навучылі нікога не баяцца, ісьці да канца й быць прынцыповымі. Вазьміце іх за прыклад.

Паўгоду навучылі мяне не здавацца й трымацца разам з аднадумцамі. Кіравацца праўдаю, жыць вераю ў свае сілы, працаю дзеля будучыні маёй краіны. Я не хачу жыць у дзяржаве, дзе дзяцей б'юць дубінкамі за тое, што яны нешта любяць. Я не хачу жыць у краіне, дзе сьмяюцца з маёй мовы, ненавідзяць маю культуру й хочуць хутчэй куды-небудзь зьмыцца. Таму я зьмяню гэтую краіну, зраблю такой, якой бачыў у мроях, пра якую чытаў у падручніках, — моцнай, прыгожай, паважанай у сьвеце. Я веру ў сябе, у сваіх сяброў, у Ліцэй, у Беларусь. Досыць! Прыйшоў час жыць так, як хочам мы!

**Франак Вячорка, Менск**

# А на форуме...

**4 лютага зайшоў на форум Вашае (ці, лепей, Нашае) паважанае газэціны і ўбачыў тое паскудзтва, якое Вы і самі, вядома, бачылі.** Хацелася б параіць Вам абмежаваць доступ на форум паролем, адзіным для ўсіх карыстальнікаў, але які б друкаваўся толькі ў папяровым варыянце і мяняўся раз на месяц. Напрыклад: хочаш зайсьці на форум — чытай друкаваны нумар. Тыя ідыёты, якія забрудзілі форум 4 лютага, наўрад ці калі-небудзь трымалі ў руках «Нашу Ніву».

**З павагай, Чытач**

# Даражэнькія, будзьце мужчынамі!



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Памятаеце цудоўны верш Самуіла Маршака, які мы ўсе праходзілі ў школе?** Як юнак ратаваў маленькую дзяўчынку з полымя? «Ищут пожарные, ищет милиция...»

Мне было восем гадоў, калі я, прачытаўшы верш, закахалася ў гэтага юнака, які назаўсёды стаўся для мяне сымбалем мужнасьці. Я ўжо ўсьведамляла сваю прыналежнасьць да жаночай паловы чалавецтва і на свой лад марыла аб каханьні. Я была ўпэўнена, што, калі вырасту, абавязкова сустрэну гэтага дужага хлопца. Зь ім прайду праз усе нягоды, усяго дамагуся, аб чым толькі мару, любую вяршыню заваюю. А калі я стамлюся, заўсёды побач будзе гэтае плячо, да якога можна прытуліцца. І ўсё жыцьцё я чакала, шукала, выглядала яго. Колькі разоў здавалася — гэта ён, і я складала да яго ног усе скарбы сваёй душы! І кожнае расчараваньне пакідала чарговую рану на сэрцы.

Прайшло жыцьцё, а гэтая сустрэча так і засталася няспраўджанай марай. Усе вяршыні давялося заваёўваць у адзіноце, хоць бывыцам і адзінокай не была. Звалішся, бывае, адператамленьня, але нічога, адляжышся — і наперад.

А як глянеш навокал, дык бачыш, што такіх, як ты, дужа багата! Дастаткова ўспомніць абвал перабудовачнага часу, калі аўтобусы з «тарбэшнікамі» ехалі ў Польшчу. Трэ было неяк сточваць канцы з канцамі, дзяцей ставіць на ногі. І колькі, вы думаеце, было мужчын у тых страшнюткіх аўтобусах? Чалавек пяць—сем. На 35 пасадачных месцаў. Дый з тых мы сьмяяліся, гледзячы на іхнае недарэчнае гандляваньне: нашто ехаў і што жонцы прывязе, калі не «прасыхае». Вядома, былі і выключэньні, але толькі як выключэньні.

Калі я сустракаю маладых мужа і жонку і яна нясе на руках чатырохгадовага хлопчыка, апранутага ў зімовыя боты і куртку, а муж побач ідзе ўлегцы, я разумею: у гэтай маладзіцы не адзін хлопчык, а два. І кожнаму патрэбна мамка, каб выціраць ім соплі. Калі я бачу, як у тралейбусе жанчына сярэдніх гадоў клапатліва ўсаджвае свайго састарэлага «героя», расьпіхваючы астатніх, і ён успрымае гэта як належнае, мне зразумела, што, нягледзячы на гады, гэта таксама саплівы хлопчык у кароткіх штоніках з мамкай.

Побач са мной працуюць мужныя жанчыны, якія на свой невялікі заробак змудраюцца «цягнуць» нават двух вучняў, а то й студэнтаў пры жывым бацьку. А той паабяцаў пасьля разводу: алімэнтаў мець не спадзявайся.

Але хопіць доўжыць бясконцыя прыклады сумнага «геройства». Хачу зьвярнуцца да нашых мужчын. Даражэнькія, будзьце мужчынамі! І ня толькі пад коўдрай! У кожны момант жыцьця памятайце — вы мужчыны! Над усімі вамі вісіць праклятый Эдыпаў комплекс. І пераадоленьне яго — заклад і нашага, і вашага шчасьця. Нядаўна я спыталася ў адной знаёмай: «Ты шчасьлівая за сваім мужам?» Яна адказала: «Я ніколі пра гэта не гавару, але ты спыталася і я прызнаюся: я такая шчасьлівая, што сама сабе зайздрошчу».

Мужчыны! Вы павінны адсекчы пупавіну псыхалягічнай залежнасьці ад дзіцячага стану, і такіх прызнаньняў, я ўпэўнена, вы пачуеце шмат!

**Галіна Люмарава, Віцебск**

## НАЎЗДАГОН

# «Ні рубля паразытам!» (№5, 2004)

* * *

Колькі б ні ўтваралі «пяцёрак з плюсам», якую б тлустую рысу ні праводзілі пад мінулым, пакуль гэтая зграя паразытаў будзе пры ўладзе — Беларусі ня жыць!

**Б.Дырында, В.Сяло, Сьвіслацкі раён**

* * *

**Зьнікненьне тэлепраграмы за старонак «НН» мяне ніколькі не засмуціла.** Мы, жыхары рэгіёнаў, страцілі ад гэтага меней за менчукоў. Тэлепраграмы сталіцы і правінцыі розьняцца. Большасьць тэлеканалаў у Сьветлагорску трансьлююцца мясцовай тэлестудыяй. Летась глядзелі мы і «ТВ-Палёнію», і «Культуру», РТР, НТВ, а да зьяўленьня «Ладу» — і ОРТ.

Ніводнага з названых вышэй каналаў цяпер няма. Асаблівая шкада «Палёніі». Замест РТР ідзе цяпер РТР «Планета»: тое, што Масква трансьлюе на Сібір. Як жартуюць нашыя дасьціпнікі, глядзім тэлевізію для чукчаў. Замест НТВ і «Культуры» ідуць праграмы ТДК і нейкі «ТТ Віясат». Глядзець на тых каналах няма чаго. Перавыжаюць тэлешоў, кшталту сумнавядомых «Вокнаў». З 1 да 7 студзеня вечарамі на тых каналах паказвалі суцэльную эротыку, але пасьля «пратэстаў грамадзкасьці» ў мясцовую вэртыкаль эратычныя праграмы зьнікл і.

У Менску ж можна цэлыя суткі глядзець і «Euronews», і «Eurosport», і іншыя добрыя праграмы. Відаць, на тое мы й правінцыя! Пра якасьць беларускіх праграмаў гаварыць не даводзіцца. Гляджу ў асноўным «Euronews» на «Ладзе» ды прагнозы надвор'я, хоць і тыя, у параўнаньні зь мінулым годам, пагоршалі. Абвяцанай на «Ладзе» беларускай мовы становіцца ўсё меней.

Не смуткуйце дзеля немагчымасьці друкаваць тэлепраграму. А на тых старонках друкуйце іншыя матэрыялы, упэўнены, іх у рэдакцыі партфэлі хапае. Чытачоў «Нашае Нівы» не паменее!

І ні «лукеранкі» паразытам!

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

* * *

**Я вельмі рад за Вашыя дзеяньні ў адносінах да паразытаў народных, якія рашылі грабіць людзей пасярод белага дня.** 5 мільёнаў 25 тысячаў рублёў за тэлепраграму хоча ўвараваць у народу Беларускае тэлеграфнае агенцтва. Гэтыя людзі ўжо апазлалі ў Навінкі. Чалавек, які ўжо сашоў з ума, да такой дурасьці ня змог бы дадумацца. Я пасьледнія гадоў 10 Беларускага тэлевізьдзеньня не гляджу, там абсалютна няма чаго глядзець акрамя аднаго ліца, якое вельмі добра вешае лапшу на вушы, т.е. хлусіць.

Старонка, якая аслабадзілась — вельмі добра, больша пішыце пра вялікага мысьліцеля-пісацеля Васіля Быкава, якому летам споўніцца 80 гадоў. Гэта вялікі вялікі патрыёт, усю сьвядомую жызьнь сражаўся за справядлівасьць, ніколі ня хлусіў, вось з такіх людзей трэба браць прыклад у жыцьці нашай маладзёжы.

Я, пакуль жыў, буду рабіць усё, каб мая ўнучка і ўнукі былі падобнымі на вялікага пісацеля Васіля Быкава.

Вялікая вам, гаспадары і гаспадыні «Нашай Нівы», дзякуй за Вашу цяжкую працу ў цяперашні час, а час вельмі цяжолы.

**Анастас Семяновіч, Бараўляны**

# Падтрымліваю Трусава...

Дзякуй Вам за добры настрой і надзею на тыдзень, бо расьцягваю задавальненьне ад пятніцы да пятніцы.

Пішу ўпершыню. Хачу падтрымаць шаноўнага старшыню ТБМ Алега Трусава, зь якім цалкам згодна. У артыкуле «Хто байца дыялёгу апазіцыі з уладамі?» ён піша: «Апазіцыя павінна ня толькі ўвесь час лаяць уладу і кожнае лета казаць, што зімой «станучь фабрыкі і заводы», а ўмець і пахваліць яе асобных прадстаўнікоў за добрыя справы. Напрыклад, за адбудову менскай Ратушы альбо за адмову ў ліпені 2003 г. пераходзіць на безнаяўны расейскі рубель» («НН» ад 6 лютага).

Ведаеце, як я стала чытаць Вашу газэту? Мой сябар завёў мяне ў шапік і купіў мне «Нашу Ніву». Можа, праўда Алега Трусава, які піша, што трэба ў час падпісной кампаніі раздаваць людзям квіткі на патрэбную газэту. Газэту Вашу чытаю вельмі даўно, гадоў восем. Прайшло шмат часу, многа адбылося падзей. У мяне расьце маленькі беларусік Ян, яму цяпер 5 гадоў і 8 месяцаў. Адна бяда — школы ў Сухараве беларускамоўнай няма, але будзем спадзявацца на лепшае, выйсьце знойдзем.

**Ала Паўлючык, Менск**

# Яшчэ пра Чорнага й Градзітар

**У надрукаваным у №3 «НН» артыкуле «Яшчэ пра Барысенку, Чорнага і Букчына» спадарыня Інэса Касьцюк дапусьціла недакладнасьць у трактаваньні майго артыкулу, зьмешчанага ў газэце «Народная воля» 5 лістапада 2003 г.** Яна беспадстаўна сьцьвярджае, што ня ўсё, аб чым паведаміла мне настаўніца-пэнсіянэрка Любоў Аронаўна Градзітар, адпавядае сапраўднасьці. І выстаўляе адзін факт, пра які ў маім артыкуле і гамонкі няма. Што Кузьма Чорны 24 чэрвеня 1941 г. ня мог быць ва Ўруччы. Але ў маім артыкуле гаворыцца толькі пра тое, як ён са сваёй жонкай і дачкой, пасьля таго як іх дом разбурыла бомба, прыйшоў у дамок Градзітараў паблізу Опэрнага тэатру. А там акрамя 13-гадовай Любы, яе цёткі і стрыечнай сястры Аленкі нікога не было: бацька знаходзіўся ў камандзіроўцы, маці, выхавацелька дзіцячага садка, у летнім лягеры ва Ўруччы. А таму як вакол домік а Градзітараў усё гарэла, іpваліся бомбы, то Кузьма Чорны павёў усіх за горад. Праўдзівасьць яшчэ зь вакол кілямэтар і з жонкай, дачкой зьнік у натоўпе бягучых людзей. Аб гэтым падрабязна гаворыцца ў маім артыкуле. Шкада, што спадарыня Касьцюк няўважліва яго прачытала. Не адмаўляю, што Чорны нёс яе на руках, але гэта ўжо другая гісторыя з таго страшнага дня 24 чэрвеня 1941 г.

**Міхась Тычына, Слуцак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Гэты фільм пра нас

## Гутарка зь Віктарам Асьлюком



АНТУАН КАТЭН

Віктар Асьлюк — рэжысэр-дакумэнталіст. Нарадзіўся ў 1961 г. у в.Ляскавічы (Петрыкаўшчына). Паводле першай адукацыі — філёляг (1984).
У 1994 г. скончыў Акадэмію мастацтваў (майстэрня Віктара Дашука).
Зьняў дакумэнтальныя фільмы «Сьлёзы блуднага сына» (1995), «Андрэевы камяні» (2000), трылёгію «Мы жывём у краі»(2002), «Кола» і «Султан з Адрынак» (2003) ды інш.
Працы бралі ўзнагароды на міжнародных кінафэстывалях у Нямеччыне, Партугаліі, Італіі, Расеі. Сябар Беларускага зьвязу кінэматаграфістаў, Эўрапейскай кінаакадэміі.
На фота: рэжысэр са сваімі дзецьмі Піліпам і Янам

**Нёман падмывае хаты, а іх старыя насельнікі штогод перапраўляюць кароў на выспу. Былы клоўн, выжыўшы пасьля аварыі, выбівае на камянях крыжы — як пакліканьне. У напаўпустой вёсцы жыве маладая сям'я зь дзіцём. Рэжысэр Віктар Асьлюк вывучае скрыжаваньне традыцыйнае культуры і сучаснасьці. Шчымлівая штодзённасьць на экране не саступае кадрам з клясычных кінашэдэўраў. За фільм «Мы жывём у краі» аўтар летась быў намінаваны на прыз Эўрапейскае кінаакадэміі.**

**«НН»: Вы першы беларускі рэжысэр, намінаваны на прыз Эўрапейскай кінаакадэміі. Што гэта за арганізацыя?**

**Віктар Асьлюк:** На прыклад Амэрыканскай кінаакадэміі ў 1978 г. была створаная Эўрапейская. Першы прэзыдэнт яе быў Бэргман, а сёньня — Вім Вэндарс. Арганізацыя аб'ядноўвае 1600 кінэматаграфістаў з усіх эўрапейскіх краінаў. Карацей, усе ведаюць амэрыканскую кінаакадэмію і яе «Оскар». Вось тое самае, толькі ў Эўропе.

**«НН»: Вашая карціна канкуравала з «Догвілем»?**

**В.А.:** Не. Мой фільм — зусім іншая намінацыя — кароткі мэтар. Але дзякуючы гэтай намінацыі карціну паказвалі штотыдзень у розных краінах, на розных фэстывалях.

**«НН»: Вы таксама галасуеце за найлепшыя фільмы?**

**В.А.:** Так. Як сябар кінаакадэміі, сёлета галасаваў за той самы «Догвіль» Трыера.

**«НН»: Некаторыя крытыкі называлі Вашыя карціны фільмамі сьлёзаў і плачу. Калі завастрыць сьцьверджаньне, то ці ня ёсьць вашыя фільмы «Мы жывём у краі», «Кола» нейкай кансэрвацыяй стану «гнілой хаткі», які крытыкаваў яшчэ Вацлаў Ластоўскі на пачатку XX ст.? Фільмы — як плач і сьлёзы над няшчаснай доляй?**

**В.А.:** Мой дэбютны фільм так і называўся — «Сьлёзы блуднага сына». Я наіўна хацеў разам з Генадзем Сагановічам і Віктарам Шалкевічам адарвацца ад гэтай традыцыі плачу беларускага і зрабіць такі злосны — калі не аптымістычны, тады проста злосны — фільм пра гісторыю войнаў у Беларусі… І ў мяне ня выйшла. Эмоцыі перамаглі, і зноў паўстала наша адвечная песьня беларуская.

Я ў прафэсіі крочу за сваімі пачуцьцямі хутчэй, чым за думкамі. Многія рэчы адчуваю, а не прадумваю, бо прадуманая рэчаіснасьць часам для мяне менш дакладная.

**«НН»: У Вашых карцінах ёсьць боль сыходу. Сыходзіць вёска, якую падмывае Нёман, — і гэта незвычайна прыгожа; сыходзяць старыя. І ці ня ёсьць у такім выпадку сьмерць існасьцю дакумэнтальнага кіно? Ці не зьяўляюцца гэтыя сыход і сьмерць паплечнікамі дакумэнталіста?**

**В.А.:** Не… Я думаю, што дакумэнталісты, і ня толькі дакумэнталісты, часам спэкулююць на тэме сьмерці і ўпадаюць у такую нэкрафілію. Бярэцца аўтарытэт сьмерці, і гэта быццам дадае аўтарытэту фільму, ускладняе сэнс.

Я стараюся зафіксаваць толькі час, які сыходзіць. Ня тое, што сыходзіць, а тое, што стварае своеасаблівае адчуваньне часу. Вядома, гэтыя бабкі, скончаецца іхні век… Я ўсімі сіламі стараюся зафіксаваць час іх існаваньня. Ня проста час, а канкрэтны час існаваньня вось гэтых людзей, вось гэтых твараў — тое, што заўсёды будзе паўтарацца і заўсёды будзе сыходзіць. Гэта важны момант кінэматаграфіі — магчымасьць зафіксаваць час.

**«НН»: Вас не зьдзіўляе рэакцыя беларускіх гледачоў? Былі даволі агрэсіўныя выказваньні: «Як можна такое паказваць!»**

**В.А.:** Ёсьць звычайнае разуменьне дакумэнтальнага кіно як кіно сацыяльнага, якое павінна паказваць сацыяльныя праблемы — з журналісцкага, публіцыстычнага боку. А я ня стаўлю перад сабой задачу здымаць кіно так. Іншая справа, што матэрыял адзін і той жа. Напрыклад, чалавек: ты бачыш, як ён жыве, дзе ён жыве, як апранаецца, нават што есьць. А гэта ацэньваецца як беднасьць, як праблема, і гэта сапраўды праблема, але я не пра гэта стараюся здымаць сваё кіно.

**«НН»: Чаму для Вас важныя гэтыя тэмы?**

**В.А.:** У гэтым, з гэтага я сам вырас. Па гэтым я маю вялікае шкадаваньне. Мяне не хвалюе тое, на што звычайна зьвяртаюць увагу гледачы: вось як героі дрэнна апранутыя, у іх няма зубоў, напрыклад. Для мяне гэта абсалютна звычайная рэч, так амаль заўсёды было ў тым асяродзьдзі, дзе я рос. Ніколі багата не жылі. Але мне шкада таго, што было. Ня беднасьці шкада, а своеасаблівага ўкладу жыцьця, які хутка разбураецца.

**«НН»: Вашы героі — у фільмах «Андрэевы камяні», «Мы жывём у краі», «Кола» — жывуць насуперак: насуперак катастрофе, якая зьнявечыла, насуперак старасьці. Здольнасьць заўжды выжываць, прага жыць — ці гэта зьява толькі беларускай рэчаіснасьці, ці, нагул, агульначалавечая?**

**В.А.:** Вядома, агульначалавечая. Калі паказваў фільм на прыз Эўропы ў Бэрліне, усходнеэўрапейскія рэжысэры падыходзілі і казалі: «Гэты фільм пра нас». Чалавечае шчасьце ў любых дэкарацыях і ў любыя часы ёсьць тэмай любога фільму, і дакумэнтальнага таксама. Але ёсьць яшчэ агульны фон. І ўся праблема ў тым, што я здымаю ў час, калі агульны фон хутчэй няшчасьця, чым шчасьця… Хоць чалавек у любым выпадку будзе… Будуць праблемы. Ён будзе ўвесь час непакоіцца. А праблемы, якія стаяць перад маімі старымі зь фільмаў, гэта праблемы ня толькі сыходу цывілізацыі ці традыцыйнай культуры. Людзі адчуваюць блізкі канец жыцьця. Гэта выяўлена ў простых словах, у простых нейкіх сытуацыях. Яны разважаюць пра гэта, таму што гэта сапраўды іх час, настае час іх паміраньня, іх сыходу. Але яны ставяцца да гэтага спакойна.

Чаму няправільна ўспрымаюць часам такія фільмы? Гэта ідзе ад успрыманьня чалавекам самога моманту сьмерці. Для большасьці людзей, асабліва «цывілізаваных», сьмерць — гэта страх, гэта нешта брыдкае, гэта нешта тое, пра што чалавек павінен ня думаць. І ўсё робіцца, каб схаваць яе прысутнасьць. Мае героі мудра ставяцца да сьмерці, спакойна.

Вось у гэтым і ёсьць такая праўдзівасьць, няштучнасьць іх існаваньня. І мне шкада гэтай няштучнасьці, бо многае ў сучаснай культуры ў адносінах да сьмерці штучна аддаленае ад праўды, ад таго, што прымушае задумацца.

**«НН»: Вы заўважаеце і фіксуеце вось гэтую спакойную мудрасьць, якая ўрэшце будзе расьцярушваца і сыходзіць…**

**В.А.:** Я заўважаю і фіксую спакойнае стаўленьне да многіх рэчаў і неабыякавасьць да многіх рэчаў, што засталася ў гэтых людзей. Вось гэта я шкадую ў тых людзях. А ня тое, што я шкадую драўляныя хаты, хаця я здымаю, стараюся здымаць гэтыя хаты… Там засталася нейкая такая ўтульнасьць, утульнасьць чалавечага жыцьця — бяз ваннага пакою, без прыбіральні цёплай, але жыцьця вельмі блізкага да зямлі, вельмі блізкага да прыроды, да прыроднага, асноўнага.

Я шкадаваў тое, што зьяўляецца, мне здаецца, асновай *нашага* сьветапогляду, я здымаў асяродзьдзе, лавіў моманты жыцьця, а не размовы пра жыцьцё.

**Працяг на старонцы 12.**

## Фільм пра Беларусь вылучаны на «Оскар»

**На прэмію «Оскар» вылучаны фільм пра беларускіх дзяцей.** Гэта дакумэнтальная стужка «Чарнобыльскае сэрца», зьнятая амэрыканкай Мэрыян Дэлеа. Аўтарка два гады працавала ў Беларусі ў складзе ірляндзкай дабрачыннай арганізацыі «Чарнобыльскі дзіцячы праект» і аб'ездзіла з калегамі ўсю краіну.

У гэтай самай намінацыі на «Оскара» прэтэндуюць стужкі «Прытулак» — пра жанчыну з Ганы, якая шукала палітычнага прытулку ў ЗША, — і «Гісторыі Фэры» — пра жаночую кампанію, якая бавіць час за абмеркаваньнем жаночых праблемаў каля люстэрка.

## Тарасэвіч у Нью-Ёрку

**Да 11 сакавіка ў Нью-Ёрскай «Gary Tatintsian Gallery» (525 West 25th Street) будзе працаваць выстава Лявона Тарасэвіча.**



АРТУР КЛІНАЎ

На ёй выстаўленыя некалькі дзясяткаў новых твораў майстра — на гэты раз не маленькіх росьпісаў, а малых (50х50) палотнаў.

## Памяці Перапёлачкі

**15 лютага легендарнай опэрнай пяюльлі Ларысе Александроўскай споўнілася б сто гадоў.** Вобразы Алесі («Алеся»), Маргарыты («Фаўст»), Марыны Мнішак («Барыс Гадуноў»), Кармэн трывала асацыююцца зь яе голасам. Ён быў візытоўкай савецкае Беларусі, у тым ліку і ў трагічныя 30-я. 14 лютага ў Музэі музычнай і тэатральнай культуры адбыўся юбілейны канцэрт.

## Мэмарыяльная заля Быкава

**На дзень народзінаў Васіля Быкава 19 чэрвеня ў прыватным Музэі выяўленчага мастацтва ў Старых Дарогах адчыніцца мэмарыяльная заля, прысьвечаная Пісьменьніку.** У фондах музэю захоўваюцца больш за 200 экспанатаў, зьвязаных з жыцьцём і творчасьцю Быкава: асабістыя кнігі, прыжыцьцёвыя партрэты й ілюстрацыі да твораў, уласнаручны малюнак, фатаздымкі. Ірына Быкава, удава пісьменьніка, абяцае музэю мужаву друкарку, узнагароды, лісты і рукапісы. Гаспадар музэю, Анатоль Белы, спадзяецца паставіць бюст В.Быкава ў дворыку Белдзяржунівэрсытэту.

## Рок на вершы Бічэль

**Гарадзенскі рок-гурт «Айша» падрыхтаваў новую праграму, якую мае прэзэнтаваць пры канцы сакавіка.** Сярод кампазыцыяў — «Крывавая Мэры» й «Чорны барон» на вершы Юр'я Гуменюка і «Хлопчык малітву сыпае…» на верш Дануты Бічэль.

## «Мядзьведзі» эмігрантам



WWW. BERLINALE.DE

Фатых Акін

**Галоўныя прызы на Бэрлінскім кінафэстывалі журы прысуджала «навырост» — рэжысэрам, якія хутчэй паказалі наяўнасьць творчага патэнцыялу, чым выявілі яго.** Другі крытэр для атрыманьня прызу — палітkарэктнасьць. Узнагароды дасталіся фільмам пра эмігрантаў — асноўную праблему заўтрашняга шматкультурнага грамадзтва.

«Залатога мядзьведзя» атрымала стужка «Галавой аб сьцяну» 30-гадовага нямецкага рэжысэра Фатыха Акіна, турка па нацыянальнасьці. Гэта жорсткая love-story пра дзяцей турэцкіх эмігрантаў, народжаных у Нямеччыне.

«Срэбранага мядзьведзя» і Гран-пры журы на Бэрлінале ўзялі «Перарваныя абдымкі» аргентынца Даніэля Бурмана, нашчадка польскіх жыдоў-эмігрантаў. У фільме распавядаецца гісторыя жыдоўскага юнака, які працуе ў буэнас-айрэскім гандлёвым цэнтры й хоча эміграваць у Эўропу. Намінацыю «найлепшая актарка» падзялілі Шарліз Тэран («Монстр» — гісторыя прастытуткі-забойцы) і Каталіна Саніна Марэна («Марыя, поўная міласэрнасьці» — аповед пра дзяўчыну, якая йдзе з Калюмбіі ў ЗША).

За найлепшую рэжысэрскую працу «Срэбранага мядзьведзя» атрымаў культавы карэйскі рэжысэр Кім Кі Дук зь фільмам «Самарыцянка». Найлепшым кароткамэтражным фільмам прызнаныя «Цыгарэты й кава» румынскага рэжысэра Крысты Пую.

## Гогаль + Шагал



STARAT.NAROD.RU

**У Расеі ўпершыню выйшлі гогалеўскія «Мёртвыя душы» з ілюстрацыямі Марка Шагала.** Вялікі мастак зрабіў 96 ілюстрацыяў у 1923—1925 г. для французскага выдаўца, які меўся надрукаваць кнігу ў Парыжы.

## Сабор сьвятога Паўла

**Другі ў сьвеце па велічыні хрысьціянскі храм — сабор сьвятога Паўла ў Лёндане мяркуюць адрэстаўраваць да 2008 г. — на 300-годзьдзе.** Сабор пацярпеў яшчэ падчас фашыстоўскіх бамбаваньняў. На рэстаўрацыю сабралі 40 млн фунтаў, прычым адных прыватных ахвяраваньняў, — урад ня даў ні шэлега.

**АШ; БелаПАН, pahonia.promedia.by, gazeta.pl**

# Гэты фільм пра нас

Працяг са старонкі 11.

Прычым ня тыя моманты, якія паказваюць там бойку, сварку, што заўсёды прыцягвае ўвагу, а стараўся выразіць тое, што зьяўляецца сутнасьцю жыцьця. Але некаторыя глядзелі мой фільм і думалі, што ён пра п'янства, пра пэнсію, пра тое, што дзеці зьехалі.

**«НН»: А дакумэнтальнае кіно ці здольнае што-небудзь зьмяніць, ці вымушанае толькі рэгістраваць?**

**В.А.:** Дакумэнтальнае кіно, як і літаратура, нічога ня можа зьмяніць. Гэта ілюзія. Тэлебачаньне можа зьмяніць палітычныя абставіны, яно можа нават вырашыць праблему выбару прэзыдэнта ці чаго іншага. Дакумэнтальнае кіно можа ўплываць толькі на невялікую колькасьць людзей, якія думаюць і адчуваюць. Гэтых людзей заўсёды мала. Асабліва тых, хто думае. А прывесьці ўсё да нейкага парадку можна толькі галавой.

**«НН»: Што для Вас, як дакумэнталіста, праўда?**

**В.А.:** Мая праўда… Праўда — гэта свабода, гэта воля. Магчымасьць быць вольным дазваляе ва ўсялякім разе думаць, што ты маеш права на праўду. Калі няма свабоды, ніякай праўды ня можа быць. А свабода ўжо складаецца з рознага. Ня толькі свабода слова, але й свабода эканамічная — калі ты можаш паехаць некуды, маеш сродкі нешта вырашыць, быць ад абставін свабодным… Яшчэ трэба самому заставацца свабодным. Самае складанае. Бо калі няма ўнутранай свабоды — няма нічога, няма ні праўды, ні магчымасьці шукаць гэту праўду.

Несвабодны чалавек упадае ў комплексы і шукае апраўданьні.

**«НН»: Хто ў кіно для Вас зьяўляецца ўзорам?**

**В.А.:** Узор — гэта важна, як і аўтарытэт, у самым пачатку біяграфіі. Чым раней ты пазбавішся ад уплыву ўзораў, тым раней станеш самім сабой. Ня быць як баязьлівец перад ударам, не дранцьвець, а спакойна ставіцца да кожнага аўтарытэту, бачыць, як гэта ўсё зроблена, і арыентавацца на самога сябе.

**«НН»: А што абсалютна непрымальна ў кіно?**

**В.А.:** Замова. Непрымальная замова палітычная, зь якога боку яна б ні была. Падругое, асабліва ў фільмах, якія прэтэндуюць на шырокі пракат, — непрымальная схема, зноў жа замоўленая часам. З прычыны такіх замоваў часта цяжка назваць фільм — кіно. Людзі склейваюць і агучваюць усё, што заўгодна, і лічаць гэта кіно.

Але ж зрэдку кіно — мастацтва.

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

# Дзесяць працэнтаў мастацтва



W.LOEPER

Цэнтар сучаснага мастацтва ў Вільні экспануе трэцяе Балтыйскае трыенале мастацкай фатаграфіі «Ars Baltica» пад назвай «Што ёсьць важным?».

Ужо ў трэці раз творцы мастацкай фатаграфіі зь дзесяці краін, што месьцяцца ўздоўж Балтыйскага мора, сабраліся разам, каб пахваліцца і абмяняцца апошнімі сваімі дасягненьнямі.

Гэта ў асноўным маладыя аўтары. Іх творы цалкам занялі залі Цэнтру сучаснага мастацтва ў Вільні. Вялізная экспазыцыя складаецца з фатаздымкаў, зробленых за апошнія тры гады. Але першае і, бадай, самае значнае ўражаньне — сучасная фатаграфія перастае існаваць сама па сабе, як асобны від мастацтва. Яе творы і прыёмы ўсё болей выкарыстоўваюцца ў якасьці аптымальнай і да таго ж мастацкай формы фіксацыі твораў, зробленых у іншых жанрах сучаснага мастацтва. 80% здымкаў на выставе — гэта фатафакты мастацкіх акцый, пэрформансаў, гепэнінгаў ды іншага, а яшчэ 10% — гэта чысты відэа-арт. Такія ж выставы адбываюцца ў вышэйназваных залях амаль штомесяц. На іх адкрыцьцях можна назіраць пэрформансы і разглядаць тыя ж інсталяцыі, толькі ўжывую. Таму гэтую экспазыцыю можна было назваць, напрыклад, «Балтыйскае трыенале сучаснага мастацтва ў фотафіксацыях». Тым ня менш, варта адзначыць тых 10% творцаў, якія выставілі менавіта мастацкае фота.

Таму, выходзячы з будынку Цэнтру сучаснага мастацтва, я сам, як фатограф, задаў сабе пытаньне: «Што ёсьць важным?» — і пакуль ня змог на яго адказаць.

Выстава будзе дзейнічаць да 29 лютага, варта паглядзець.

**Дзяніс Раманюк**

## ДЫСКАГРАФІЯ

## С Новым годом!




Сяргей Кавалёў, 2004, дэма

Сяргей «Доктар» Кавалёў вядомым зрабіўся ў дуэце з Кірылам Слуком. Цяпер працуе самастойна, і песьні ягоныя слухаць можна бяз боязі, што цябе «закалбасіць» да таго, што давядзецца запісвацца да самога Кавалёва на прыём. «Sexy», «Точка BY», «23:17», сьціплая «Минск — это я» — узоры высакаякаснай прадукцыі, цалкам фарматнай, як кажуць адфарматаваныя праграмныя дырэктары FM-станцый. Песьні Кавалёва без аніякіх прэтэнзій на зорнасьць, шлягернасьць. Можа, з гэтай прычыны і слухаюцца з прыемнасьцю. Нават у нечым заказная-запатрабаваная грамадзкасьцю песьня «Опер», якой супрацоўнікі крымінальнага росшуку могуць быць цалкам задаволеныя.

Шкада, што дагэтуль «Доктар» ня здолеў падступіцца да праекту, пра які ён расказаў гады з тры таму. А муліць яму напісаць цыкл цалкам папулярных песень на вершы Рыгора Барадуліна. Гэта можа выліцца ў сэнсацыю. Бо чым-чым, але мэлядычным талентам ён адораны вельмі шчодра, і калі гэты альбом будзе тыражаваны, сваіх прыхільнікаў ён безумоўна знойдзе.

Каб уся папса была на такім узроўні, я б, напэўна, не адрываўся ад расейскіх тэлеканалаў, не прапускаў бы ніводнага выданьня «Скрыгатаньняў Эўропы», лавіў бы кожны «Гітмамэнт»!

**Здаровы СЛУХАЧ**

## Свет и тени




Баржомі, 2004

Пра гэты альбом пісаць даводзілася й раней, аднак тады ён існаваў толькі як дэма-выданьне. Цяпер альбом тыражаваны, а таму ёсьць нагода нагадаць, хто хаваецца пад яго вокладкай.

Найперш — гітарыст Аляксандар Атчанашанка, які і напісаў усе сем інструмэнтальных кампазыцый, стылістыкай блізкіх да папулярнага кірунку smooth-jazz. Група сабрала музыкаў з трох гарадоў: **БАР**ысава (нешта барысаўскія разыграліся апошнім часам!), **ЖО**дзіна і **М**енску. Так што музыкі ня горную мінэралку рэклямуюць, а ўласныя гарады. Музыка для прыемнага, утульнага слуханьня, а выкананьне, заснаванае на дыялёгах гітары А.Атчанашанкі і скрыпкі Юліі Сымановіч, заслугоўвае самай высокай ацэнкі. Шкада, што група мала выступае і шырока «засьвяцілася» толькі на перадапошняй «Грыфаманіі».

Зьместоўная, інтэлігентная, тонкая работа. Такіх вельмі не стае беларускай папулярнай музыцы. Настойліва раю паслухаць.

**Баржомны СЛУХАЧ**

# Карнавальны тыдзень


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**З 16** да **22 лютага** (пан.—нядз.) — Масьлены (Сырны) тыдзень, сьвята сканчэньня зімы, апошнія сем дзён перад пачаткам Вялікага посту, час карнавалаў і Масьленкі — шумны, вясёлы, з гульнямі, пераапрананьнямі, наведваньнем сваякоў і абавязковым шчодрым пачастункам. Гэтыя дні слаўныя былі на малочныя стравы: пры канцы зімы цяліліся кароўкі, таму малака ставала. Масла, сьмятана й, вядома, бліны — сымбаль сонца — абавязковая абрадавая ежа цягам усяго Масьлянага тыдня.

Калі хто не пасьпеў пацешыцца зімовымі гульнямі, Масьленка дае апошні шанец. Зьбірайце кампанію й выпраўляйцеся на горку з санкамі або лыжамі. Праводзіны зімы з карагодамі, катаньнем на конях і блінамі штогод ладзяць пад Менскам у Дудутках. Праўда, там Масьленка пастаўленая на камэрцыйную аснову.

У Заходняй Эўропе — час карнавалаў. На шчасьце, цяпер няма патрэбы зь іх дапамогаю адганяць чуму, як у сярэднія вякі. У ангельскім Ёрку адбываецца Фэстываль вікінгаў, у Брэдфарце — Піўны фэст, гудуць карнавалы ў Брэмэне, Кёльне, Майнцы й Бэншы, грымяць Вялікі карнавал у Мадрыдзе і славуты двухтыднёвы Вэнэцыянскі карнавал. Падчас Сырнага тыдня (**з 13 да 25 лютага**) праходзіць і традыцыйны фэст у Ніцы: фаервэркі, музыка, шыкоўныя парады кветак... Калі дазваляюць грошы, а ў Дудутках ужо былі — акунайцеся ў вір неўтаймаванай карнавальнай весялосьці.

## Адзежа—Абутак—Тэкстыль

**З 24 па 27 лютага** (аўт.—пятн.) у Выставачным комплексе на пр.Машэрава, 14 пройдзе выстава «Адзежа—Абутак—Тэкстыль». Пазначанае, а таксама дываны, пасьцельная бялізна, аксэсуары — на ўсе густы. У рамках выставы пройдуць сэмінары спэцыялістаў у галіне гандлю, можна падвучыцца ды навязаць новыя кантакты.

## Шапэн

**25 лютага** (сер.) у Канцэртнай залі Беларускай акадэміі музыкі (вул.Інтэрнацыянальная, 30) пройдзе лекцыя-канцэрт «Шапэн — паэт фартэпіяна». Апроч уласна лекцыі наведнікі пачуюць мазуркі, нактурны ды вальсы знакамітага кампазытара. Пачатак а 19-й, уваход вольны.

## Спытайце ў Аляксандры й Канстанціна

**Хто яны, Аляксандра й Канстанцін — муж і жонка?** Брат і сястра?.. Пытаньні першым беларускім удзельнікам «Эўрабачаньня» дасылайце **да 23 лютага** праз электронную скрыню ak@fromby.net. На сайце ж www.aik.fromby.net можна знайсьці інфармацыю пра «А&К», спампаваць песьні, паглядзець здымкі.

## Мулявін і Гусоўскі на Багдановіча

**Музэй гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 15) прапануе выставы — «Студзеньская мэлёдыя камянёў», прысьвечаная творчасьці Ўладзімера Мулявіна, і «Мікола Гусоўскі. Голас XVI ст.».** Выходны ў музэі ў панядзелак. Т.: 234-72-61



Да 700-годзьдзя
з дня нараджэньня
Франчэска Пэтраркі

Беларускі ПЭН-цэнтар
пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі журналістаў, газэтаў «Белорусская деловая газета», «Биржа информации», «Барысаўскія навіны», «Витебский курьер», «Вечерний Брест», «Вольны час», «Газета Слонімская», «Інтэкс-press», «Навінкі», «Народная воля», «Наша Ніва», «Наша слова», «Новы час», «Рэгіянальная газета», «Региональные ведомости», «Телевид-инфо», часопісаў «Arche», «Студэнцкая думка», «Дзеяслоў», «Мясцовы час», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com», «Дзед Талаш», «Пагоня.promedia.by»

**аб'яўляе творчы конкурс для маладых літаратараў:**

# Твор пра каханьне

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 22 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы ў сталіцу, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.)

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 сакавіка 2004 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 сакавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску 29 красавіка — 2 траўня.
Лаўрэаты леташняга конкурсу імя Натальлі Арсеньневай маюць права ўдзельнічаць і сёлета.

Журы конкурсу: Лявон Баршчэўскі (старшыня), Пятро Васючэнка, Ганна Кісьліцына, Міхась Скобла, Андрэй Хадановіч.

Творы дасылайце на адрас: e-mail: pen@pen.unibel.by;
паштовы адрас: РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар», а/с 218, 220050, Менск.

Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 288-14-61.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Скінь бабульку з другога паверху

Ня кожны беларус ведае, што такое дзюплекс. Адказ на гэта можна атрымаць ужо ў самым пачатку аднайменнага кінафільму: так у Амэрыцы называюць двухузроўневую кватэру. Алекса і Нэнсі (Бэн Стылер і Дру Бэрымар), якія шукаюць сабе жытло ў Брукліне, вельмі цешыць прапанова купіць такі дзюплекс па цане аднапавярховых апартамэнтаў. Цана зьніжаная з прычыны пражываньня на верхняй палове бабулькі (Эйлін Эсэл) — зусім бяскрыўднай на выгляд. На справе, аднак, бабулька аказваецца зусім не бяскрыўднай. Усё жыцьцё маладых мужа і жонкі ляцяць дагары нагамі, і ў іх галовах пачынаюць зьяўляцца нават крымінальныя думкі…

Што ж, старасьць трэба шанаваць, гэта ўсім вядома. Але што рабіць, калі старасьць не дае табе жыць? Наўрад ці варта дзейнічаць так, як Алекс і Нэнсі, бо, як кажа прымаўка, хто на другога яму капае, сам часта ў яе ўпадае. І нават прафэсійным кілерам часам не па зубах стогадовыя пэнсіянэркі. Вось да якіх павучальных высноў падводзіць «Дзюплекс», але робіць гэта ненавязьліва і так, што нудна вам ня будзе. Яшчэ адна камэдыя ў Дэні дэ Віта атрымалася ўдала. І доля чорнага гумару ў ёй не зьбянтэжыць ніякую аўдыторыю — нават тых самых пэнсіянэрак.

**Іван Пятроў**


WWW.MOVIEWEB.COM

АФІША

## Асацыяцыі

Пад такою назваю да **1 сакавіка** праходзіць у М-Галерэі Інстытуту Гётэ (вул.Фрунзэ, 5) выстава жывапісу Вікторыі Каваленчыкавай. Час працы экспазыцыі — з 9.00 да 17.30 (пятніца — да 16-й). Выходныя — субота, нядзеля. Т.: 236-73-14.

## Сучасны іканапіс

Да **9 сакавіка** ў Мастацкім музэі (вул.Леніна, 20) працуе выстава «Беларускі праваслаўны іканапіс к. XX — п. XXI ст.». Штодня, апроч аўторка, з 11 да 19-й.

## Кераміка, жывапіс, графіка

Да **23 лютага** Музэй гісторыі й культуры (вул. Маркса, 12) прапануе выставу твораў Кацярыны Паплаўскай.

## Опэра

**21 лютага** (суб.) у Опэрным — «Аіда» Вэрдзі. Т.: 234-10-41.

## Балет

**22 лютага** (нядз.) даюць «Рамэо й Джульету» Пракоф'ева. Т.: 234-06-66.

## Камэдыя

**22 лютага** (нядз.) на сцэне ДК прафсаюзаў — «Камэдыя». Знакамітая пастаноўка пра Чорта ды Дзям'яна, якая карыстаецца нязьменным посьпехам. Т.: 262-05-88.

## Тэатар беларускай драматургіі

**25 лютага** (сер.) на Крапоткіна, 44 можна пабачыць «Чарнобыльскую малітву» С.Алексіевіч — сумесны франка-беларускі праект.

## Арфа

**21 лютага** (суб.) у Залі камэрнай музыкі (касьцёл Сьв.Роха) прагучыць праграма «Мастацтва арфы ў опэры» — выканаўца Т.Чарыева, удзельнічаюць таксама У.Міцэнка (скрыпка) і К.Праватарава (арфа).

## Фартэпіяна

**23 лютага** (пан.) Жэром Дзюкро (Францыя) грае ў Залі камэрнай музыкі творы Баха, Бэтговэна, Шубэрта.

## Князь Вітаўт

**20—22 лютага** (пятн.—нядз.) у Купалаўскім тэатры ідзе «Князь Вітаўт» А.Дударава.

## Не-фармат

**22 лютага** (нядз.) у клюбе «NC» (вул. Кастрычніцкая, 17) з 17 да 22-й пройдзе фэст авангарднае творчасьці «Не-фармат». У праграме — пэрформансы, паэтычныя чытаньні, канцэрт. Даведкі праз т.: 8-029-778-75-31.

КІНААФІША

## «Аўрора» (253–33–60)

«Трупа» — **20 лютага** (пятн.) 18.50, 20.50

«Змрочны самурай» — **21 лютага** (суб.) 18.50, 20.50

«Шок і жах» — **22 лютага** (нядз.) 18.50, 20.50

«Кепскія хлопцы-2» — **20 лютага** (пятн.) 16.20; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 13.40, 16.20

«Мішэль Вальян: Прага хуткасьці» — **20 лютага** (пятн.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00

«Міс Мядзьведзіца» (д.) — **20 лютага** (пятн.) 12.30, 14.30; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 13.00

## «Берасьце» (272–87–91)

«Анёлы Чарлі-2: Толькі наперад» — **20—22 лютага** (пятн.—нядз.) 16.40, 18.50, 21.00

«Зорка» — **20 лютага** (пятн.) 15.00

«Дзеці шпіёнаў-3D: Гульня скончаная» — **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 13.00 (ільг.), 14.50

Зборнік мультфільмаў (д.) — **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 11.30

## «Кастрычнік» (232–93–25)

«Чумавая пятніца» — **20 лютага** (пятн.) 15.00, 17.00, 19.00; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 15.00 (ільг.), 17.00, 19.00

«Другі бок ложка» — **20—22 лютага** (пятн.—нядз.) 21.00

## «Масква» (223–14–48)

«Навагодні паштальён» (д.) — **20 лютага** (пятн.) 10.30

«Дзюплекс» — **20 лютага** (пятн.) 17.00, 19.00, 21.00; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 15.00 (у нядзелю — ільг.), 17.00, 19.00, 21.00

## «Мір» (284–37–71)

«Шок і жах» — **20 лютага** (пятн.) 19.00, 21.10

«Кругласутачныя тусоўшчыкі» — **21 лютага** (суб.) 19.00, 21.10

«Трупа» — **22 лютага** (нядз.) 19.00, 21.10

«Рэальнае каханьне» — **20 лютага** (пятн.) 18.20, 20.40; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 16.00, 18.20, 20.40

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **20 лютага** (пятн.) 15.30; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 12.00 (ільг.), 15.30

«Дзеці дажджу» — **20—22 лютага** (пятн.—нядз.) 14.00

## «Перамога» (223–77–66)

«Змрочны самурай» — **20 лютага** (пятн.) 14.30, 16.40, 18.50, 21.00

«Шок і жах» — **21 лютага** (суб.) 14.30 (ільг.), 16.40, 18.50, 21.00

«Кругласутачныя тусоўшчыкі» — **22 лютага** (нядз.) 14.30 (ільг.), 16.40, 18.50, 21.00

## «Цэнтральны» (220–34–16)

«Кругласутачныя тусоўшчыкі» — **20 лютага** (пятн.) 18.30, 21.00

«Трупа» — **21 лютага** (суб.) 18.30, 21.00

«Змрочны самурай» — **22 лютага** (нядз.) 18.30, 21.00

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **20 лютага** (пятн.) 11.00, 14.40; **21, 22 лютага** (суб., нядз.) 11.00 (ільг.), 14.40

**Тацяна Вабішчэвіч, СБ**

### Чым бы лукамол ні цешыўся

**Слуцкія гарадзкі й раённы камітэты БРСМ далучыліся да акцыі «Пісьмо прэзыдэнту».** У традыцыях колішняга камсамолу, актывісты якога ў 30-я зьбіралі подпісы пад пісьмом беларускага народу Сталіну. Сёньняшнія іх пасьлядоўнікі зьвярнуліся праз мясцовы друк да школьнікаў з заклікам напісаць Аляксандру Рыгоравічу пра тое, што іх хвалюе і якой яны ўяўляюць Беларусь у будучыні. Свае лісты дзеці павінны накіроўваць ня ў менскую рэзыдэнцыю, а ў гарадзкі і раённы камітэты БРСМ. Добра, калі іх там ня будуць ускрываць для праверкі, а толькі пакаваць у мех — каб у сталіцы засьведчылі іх, камітэтчыкаў, рупнасьць у рабоце па ўцягненьні ў свае шэрагі як мага большай колькасьці моладзі.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

# Часовая перамога

**Віцебскія прадпрымальнікі лічаць, што іхная галадоўка скончылася перамогай: у суботу віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў паабяцаў прадпрымальнікам, што яны «будуць працаваць як працавалі». Праўда, віцэ-прэм'ер адначасова заявіў, што «рашэньне мясцовых уладаў было законным і слушным». Перамога часовая?**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Пэрспэктывы Полацкай вобласьці

**50 гадоў таму, 8 студзеня 1954 г., была скасаваная Полацкая вобласьць.** Разам зь ёй зьніклі яшчэ чатыры вобласьці — Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская (з цэнтрам у Мазыры) і Пінская. У 1960 г. ня стала і Маладачанскай. Скарачэньне тлумачылі неабходнасьцю зьменшыць армію бюракратаў. Тэрытарыяльную структуру Беларусі падагналі пад агульнасавецкія стандарты, бо ў Расеі вобласьці былі большыя.

Полацкая вобласьць мела плошчу 17,8 тыс. кв. км, 400 тыс. жыхароў і шэсьць гарадоў — Браслаў, Глыбокае, Дзісна, Докшыцы, Дрыса, Полацак. Мястэчкаў таксама было шэсьць — Асьвея, Відзы, Друя, Дунілавічы, Ушачы, Шаркаўшчына. Вобласьць падзялялася на 15 раёнаў і 217 сельсаветаў.

На пачатку 90-х у Беларусі быў распрацаваны праект рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Меркавалася стварыць 20 вялікіх тэрытарыяльных сыстэм — паветаў. Іх цэнтрамі павінны былі стаць усе большыя гарады. Тады ўрад Кебіча на зьмены не пайшоў.

Аднак у пэрспэктыве рэформа ўсё ж адбудзецца. Намесьнік дырэктара НДІ горадабудаўніцтва Зьміцер Семянкевіч распавёў, што пры канцы 2003 г. на стол Аляксандру Лукашэнку легла новая канцэпцыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. У адным варыянце прадугледжваецца стварэньне 24 абласьцей; другі захоўвае цяперашні падзел, толькі зь невялікімі зьменамі межаў і магчымым утварэньнем некалькіх новых абласьцей. Найбольшыя шанцы стаць абласнымі цэнтрамі маюць Полацак і Мазыр. Такім чынам, гісторыя Полацкай вобласьці можа мець працяг.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Скрадзены мамантаў бівень

**З грамадзкага музэю экспэрымэнтальнай базы «Вусьце» (Аршанскі раён) нехта скраў бівень маманта.** Рэшткі прадстаўнікоў ледавіковай фаўны часта знаходзілі ў 1960—70 г. падчас здабычы пяску з разьмешчанага побач кар'еру. Найлепшыя экзэмпляры тады апынуліся ў Менску, Віцебску ды Воршы. Па факце крадзяжу адметнага экспаната заведзеная крымінальная справа, але злодзей пакуль ня знойдзены. Дарэчы, шмат грошай за бівень атрымаць наўрад ці ўдасца, бо яго даўжыня ўсяго каля мэтра, дый якасьць косткі дрэнная. У Расеі за кілаграм біўняў цудоўнай захаванасьці даюць некалькі сотняў даляраў.

### Ворша бяз вольнага слова

**Не шанцуе Воршы зь незалежным друкам.** З пачатку 1990-х толькі газэта «Куйцейна» выходзіла зь перапынкамі некалькі гадоў. Астатнія газэты, назваў якіх ужо і не прыпомніш, існавалі лічаныя месяцы. Такі ж сумны лёс спасьцігнуў і аршанскі рэгіянальны выпуск газэты «Віцебская трыбуна». Першы яго нумар пабачыў сьвет у красавіку 2003 г., апошні, шаснаццаты, — у сьнежні. Заснавальнікам выданьня быў цэнтар грамадзкіх ініцыятыў «Контур» (Віцебск), ліквідаваны ўладамі. Некалькі нумароў удалося надрукаваць і пасьля гэтага. Але вось ужо два месяцы рэгіянальны выпуск не выходзіць. Спробы мясцовых дэмакратычных арганізацый ды журналістаў зарэгістраваць новае выданьне ў Менску ці Воршы посьпеху не далі. Горад на 140 тыс. жыхароў ізноў застаўся безь незалежнай прэсы.

### Ня вытрымаў дах

**Пад цяжарам сьнегу абвалілася частка даху на будынку былога кляштару базыльянаў у Воршы.** Стан помніка архітэктуры XVIII ст., унесенага ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў, аварыйны. А менавіта тут пасьля напалеонаўскага нашэсьця было знойдзена знакамітае Аршанскае эвангельле. У духоўным вучылішчы, што існавала пры Пакроўскім манастыры, выкладаў Іван Насовіч, вучыўся Міхась Зарэцкі. У 1920—30-я тут працаваў Аршанскі акруговы музэй (завулак, на якім месьціцца будынак, і цяпер завецца Музэйным). Пры канцы 1980-х з былога кляштару адсялілі жыхароў ды мастацкія майстэрні. Цяпер мастакі туляцца ў драўляным будынку былой карчмы XIX ст., стан якой яшчэ больш жудасны. Тады ж быў распрацаваны праект рэстаўрацыі былога кляштару пад мастацкі музэй. Але ня знойдзеныя грошы нават на кансэрвацыю будынку, які паціху працягвае разбурацца.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Пáлі вінаватыя

**Абвалілася частка сьцяны аднаго з прыватных дамоў у Горках.** Раённая камісія па надзвычайных сытуацыях вінаваціць гаспадароў — маўляў, ня чысьцілі сьнег на страсе. Між тым на стромай страсе сьнег не трымаўся, і ў момант абвалу яна была практычна чыстая. Як кажуць жыхары, сьцяна абвалілася праз расколіну, што ўтварылася некалькі гадоў таму, калі побач, на новай будоўлі, пачалі заганяць пáлі. Расколіны зьявіліся і ў сьценах іншых дамоў, іх папросту пазамазвалі цэмэнтам.

**Эдуард Брокараў, Горкі**

### Срэбны коньнік

**У мінулую суботу ў будынку Менскага абласнога драмтэатру ў Маладэчне адбылася вечарына, прысьвечаная выхаду зборніка вершаў Лявона Цімохіна «Срэбны коньнік».** Лявон Цімохін — настаўнік гісторыі адной зь сярэдніх школаў Маладэчна, кіраўнік школьнага літгуртка «Прамецьчык». Да гэтага дня ў паэта не было зборніка. Вершы пераходзілі з рук у рукі на нейкіх асобных паперках, перапісваліся, перадрукоўваліся. І вось нарэшце з дапамогай сяброў сп.Лявон выдаў цудоўны томік.

На прэзэнтацыі былі маладачанскія паэты й аматары паэзіі; госьці з сталіцы — Генадзь Бураўкін, Сяргей Законьнікаў, Анатоль Вярцінскі, Аляксей Марачкін і інш.; прыехалі з-за мяжы на сьвята былыя вучні Л.Цімохіна.

Чытаньне вершаў праходзіла пад акампанэмэнт фартэпіяна ды скрыпкі. Верш Л.Цімохіна «Малітва» пад музыку «Ave Maria» не пакінуў ніводнага прысутнага абыякавым. Сустрэча была прыцягальная і тым, што нічога не было заплянавана, адрэпэтавана — удзельнікі імправізавалі. Гэтак сябры павіншавалі Лявона Цімохіна з 60-годзьдзем.

**Юрась Бусел, Маладэчна**

### Татуяваньне ў аптэцы

**Паслугу па «набіваньні» татуіровак пачала аказваць бабруйчанам адна з аптэк гораду.** Кожны ахвотны можа выбраць у імпартных каталёгах узор тату, якую спэцыяліст нанясе на любую частку цела.

**Віктар Качан, Бабруйск**



Лявон Вольскі (Н.Р.М.), Сяргей Міхалок (Ляпіс Трубяцкі), Аляксандар Кулінковіч (Нэйра Дзюбель)
сярод уладальнікаў квіткоў за 35 000 будуць разыграны 3 месцы на вячэру з рок-каралямі ў «Камяніцы»

# Нацыя мясаедаў

Паводле зьвестак Мінстату, летась беларусы зьелі мяса і мясапрадуктаў на 9,1% болей, чым пазалетась. Пракаветная мара даўнейшых пакаленьняў пра тое, каб на стале штодня вялося скаромнае, пакрысе ўвасабляецца ў рэчаіснасьць. Народныя казкі пра паноў і мужыкоў з гастранамічна-дыетычным стрыжнем, відаць, ужо ня будуць зразумелыя тым, хто не застаў напаўпустых савецкіх прылаўкаў, картак і «пяцірублёўкі» па блаце.

Канцэпцыі г.зв. здаровага харчаваньня перапісваюцца, здаецца, часьцей за зводкі надвор'я. Учора цэлыя краіны і кантынэнты захапляюцца садавінай і гароднінай, сёньня сур'ёзныя інстытуты даводзяць, што насамрэч дамінаваньне ў кухні расьліннае ежы вельмі небясьпечнае, бо ў прамысловым маштабе нічога без азотных тукаў не вырошчваецца, а нітраты-нітрыты, нават у дапушчальных колькасьцях, на парадак небясьпечнейшыя за халестэрыны-халестэролы. Учора адмыслоўцы хорам кажуць пра шкоду тлушчаў, сёньня японскія дасьледчыкі адкрываюць, што толькі ў сьвіным сале ёсьць нейкія цуда-фэрмэнты і альфапратэіны, якія нармалізуюць абмен рэчываў; прызначаюцца нават сальнабэконныя дыеты для... схудненьня. На дзяржаўным узроўні бяруцца за тое, каб накарміць нас морскай і акіянічнай рыбай, а дзяржаўны ж мэдычны часопіс друкуе вынікі шматгадовага дасьледаваньня, дзе даводзіцца, што есьці чалавек мусіць толькі тое, што здабываецца ў арэале ягонага жыцьцёвага перабываньня. То бок усё, што ўзятае далей за 200 км ад таго месца, дзе ты нарадзіўся і вырас, — ці тое вада, ці птушка, ці кальмар які альбо яблык, — на карысьць ня пойдзе. Дзе рацыя?

Прыгадайце бабулек нашых вясковых, што па 80—90—100 гадоў жывуць і да апошняга дня самі кароўку дояць. Мужыкі іхныя, каб ня войны ды тытунь, ня меней жылі б. Ядуць яны скваркі і засолы, масла і бліны, варэньне і грыбы, усё малачком шасьціпрацэнтным запіваюць, а для апэтыту і ад чаркі самагнётнае не адмовяцца. Паводле дактароў — дык ім хоць зараз кладзіся й памірай, бо рацыён «нездаровы і незбалянсаваны». Але ж во маюцца сабе паціху, праўнукаў улетку дагдядаюць, а сям-там і радыяцыю перамагаюць.

Яшчэ прачытаў, што пэратраўліваньне мяса мае на ўвазе спакой і адпачынак. Менавіта пасьля дзьвюх адбіўных у абед, калі вочы зьліпаюцца, а нос міжволі скіроўваецца кудысьці ніжэй манітора, — у гэты самы час нэрвовая сыстэма вызваляецца ад наступстваў стрэсаў, разьнявольваецца і набіраецца сілаў для чарговых рыўкоў і выпрабаваньняў. Ільвы, паеўшы мяса і паспаўшы суткі, адчуваюць сябе вельмі ёмка і ўпэўнена. І чалавек-мясаед праз апісаныя працэсы робіцца ўраўнаважаным, добрым і спакойным. Шчыра прызнацца, я сам, гледзячы на знэрваваных і анэмічных вэгетарыянцаў, даўно тое падазраваў. Відаць, і ўлады нашыя пра тое ведаюць, бо сельгасвытворчасьць заўсёды фігуруе сярод першых стратэгічных дзяржаўных прыярытэтаў. Калі скончаецца мяса, пачынаецца рэвалюцыя. І ніякія тады тэлепросьбы патрываць і абысьціся тваражком не займеюць плёну.

Вось, значыцца, у мясе схаваны сакрэт славутае нашае памяркоўнасьці, трываласьці і цярпеньня. Дык жа ня слухайце, спадарства, гэных вучоных: ежце што Бог паслаў і не пакідайце традыцыі нашай мясаедзкай, каб ня ўмерці. Смачнага вам!

**Вадзім Карцаў**

# Жыць без ілжы

Аляксандар Салжаніцын

**12 лютага 1974 году расейскі пісьменьнік-дысыдэнт, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі Аляксандар Салжаніцын падпісаў зварот да суайчыньнікаў пад назвай «Жыць без маны». Роўна праз трыццаць гадоў пасьля гэтага Сяргей Паўлоўскі пераклаў яго на беларускую мову.**



MP.URBANNET.RU

Калісьці мы ня сьмелі і шэптам шаргацець. Цяпер вось пішам і чытаем самвыдат, а ўжо адзін аднаму ў курылках НДІ ад душы наскардзімся: чаго толькі яны ні напракудзяць, куды толькі ні цягнуць нас! Тут і непатрэбнае касьмічнае выхваляньне пры развале і беднасьці жыцьця; і ўмацаваньне далёкіх дзікіх рэжымаў; і распальваньне грамадзянскіх войнаў; і безаглядна выгадавалі Мао Цзэдуна (на нашы сродкі) — і нас жа на яго пагоняць, і прыйдзецца ісьці, куды дзенешся? І судзяць каго хочуць, і здаровых заганяюць у вар'яты — усё «яны», а мы — бясьсільныя.

Ужо да донца даходзіць, ужо ўсеагульная духовая пагібель насунулася на ўсіх нас, і фізычная вось-вось запалае і спаліць і нас, і нашых дзяцей, — а мы па-ранейшаму ўсё ўсьміхаемся баязьліва і лапочам коснаязыка: «А чым жа мы перашкодзім? У нас няма сілаў». Мы так безнадзейна расчалавечыліся, што за сёньняшнюю нішчымную кармушку аддамо ўсе прынцыпы, душу сваю, усе намаганьні нашых продкаў, усе магчымасьці для нашчадкаў — толькі б не разладзіць свайго лядачага існаваньня. Не засталося ў нас ані цьвёрдасьці, ані годнасьці, ні сардэчнага гарэньня. Мы нават усеагульнай атамнай сьмерці не баімся, трэцяй сусьветнай вайны не баімся (можа, у расколінку схаваемся), — мы толькі баімся крокаў грамадзянскае мужнасьці! Нам толькі б не адбіцца ад статку, не зрабіць кроку паасобку — і раптам аказацца бязь белых булак, бяз газавай калёнкі, без маскоўскай прапіскі.

Ужо як дзяўблі нам на паліттуртках, так у нас і ўдзяўблося, выгодна жыць, абы на ўвесь век добра: асяродзьдзе, сацыяльныя ўмовы, зь іх ня выскачыш, быцьцё вызначае сьвядомасьць, мы тут пры чым? мы нічога ня можам.

А мы можам — усё! — але самі сабе хлусім, каб сябе заспакоіць. Ніякія не «яны» ўва ўсім вінаватыя — мы самі, толькі мы!

Запярэчаць: але ж сапраўды нічога не прыдумаеш! Нам заляпілі рот, нас ня слухаюць, у нас не пытаюцца. Як жа прымусіць іх паслухаць нас?

Пераканаць іх — немагчыма.

Натуральна было б іх пераабраць! — але перавыбараў не бывае ў нашай краіне.

На Захадзе людзі знаюць страйкі, дэманстрацыі пратэсту, — але мы занадта забітыя, нам гэта страшна: як гэта раптам — адмовіцца ад працы, як гэта раптам — выйсьці на вуліцу?

А ўсе іншыя фатальныя шляхі, што за апошнае стагодзьдзе апрабаваныя ў горкай расейскай гісторыі, — тым больш не для нас, і насамрэч — ня трэба! Цяпер, калі ўсе сякеры свайго дасякліся, калі ўсё пасеянае ўзышло, — нам бачна, як заблукаліся, як учадзелі тыя маладыя, самаўпэўненыя, хто думалі тэрорам, крывавым паўстаньнем і грамадзянскай вайной зрабіць краіну справядлівай і шчасьлівай. Не ўжо, дзякуй, бацькі асьветы!

> Няхай хлусьня ўсё пакрыла,
> няхай хлусьня валодае ўсім,
> але ў самым малым
> заўпарцімся: няхай валодае
> не празь мяне!

Цяпер ужо ведаем мы, што гнюснасьць мэтадаў месьціцца ў гнюснасьці вынікаў. Нашыя рукі — хай будуць чыстымі!

Дык кола — замкнулася? І выйсьця — насамрэч няма? І застаецца нам толькі бязьдзейна чакаць: раптам здарыцца нешта само?

Але ніколі яно ад нас не адліпне само, калі ўсе мы ўвесь час будзем яго прызнаваць, услаўляць і мацаваць, калі не адштурхнёмся хоць бы ад самай яго адчувальнай кропкі.

Ад — ілжы.

Калі гвалт урываецца ў мірнае людзкое жыцьцё — ягоны твар палае ад самаўпэўненасьці, ён так і на штандары піша, і крычыць: «Я — Гвалт! Разыдзіся, расступіся — стапчу!» Але гвалт хутка старэе, крыху гадоў — і ён ужо няўпэўнены ў сабе, і, каб трымацца, каб выглядаць прыстойна, — ён выклікае сабе ў хаўрусьнікі Хлусьню. Бо: гвалту няма чым прыкрыцца, акрамя хлусьні, а хлусьня можа трымацца толькі гвалтам. І ня кожны дзень, не на кожнае плячо кладзе гвалт сваю цяжкую лапу: ён патрабуе ад нас толькі пакоры да хлусьні, штодзённага ўдзелу ў хлусьні — і ў гэтым усё вернападданства.

І вось тут якраз ляжыць занядбаны намі, самы просты, самы даступны ключ да нашага вызваленьня: асабісты няўдзел у хлусьні! Няхай хлусьня ўсё пакрыла, няхай хлусьня валодае ўсім, але ў самым малым заўпарцімся: няхай валодае не празь мяне!

І гэта — прасьвет ва ўяўнай аблозе нашае бязьдзейнасьці! — самы лёгкі для нас і самы разбуральны для хлусьні. Бо калі чалавек адхіснуўся ад хлусьні — яна папросту перастае існаваць. Як зараза, яна можа існаваць толькі на людзях.

Не заклікаемся, не сасьпелі мы ісьці на плошчы і прагалошваць праўду, выказваць уголас, што думаем, — ня трэба, гэта страшна. Але хоць адмовімся казаць тое, чаго ня думаем!

Вось гэта і ёсьць наш шлях, самы лёгкі і даступны пры той арганічнай баязьлівасьці, што прарасла ў нас, нашмат лягчэйшы за (страшна прамовіць) грамадзянскае непадпарадкаваньне паводле Гандзі.

Наш шлях: ні ў чым не падтрымліваць хлусьні сьвядома! Усьвядоміўшы, дзе мяжа хлусьні (кожнаму яна яшчэ па-рознаму відна), — адступіцца ад гэтай гангрэннай мяжы! Не падклейваць мёртвых костачак і лушчынак Ідэалёгіі, не сшываць гнілога рызьзя — і мы ўражаныя будзем, як хутка ды бездапаможна хлусьня ападзе, і чаму належыць быць голым — тое зьявіцца сьвету голым.

Такім чынам, цераз баязьлівасьць нашу хай кожны выбера: ці застаецца ён сьвядомым служкам хлусьні (о, натуральна, не дзеля схільнасьці, але для пракармленьня сям'і, для выхаваньня дзяцей у духу хлусьні!), ці прыйшла яму пара страпянуцца, стаць сумленным чалавекам, вартым павагі і дзяцей сваіх і сучасьнікаў. І з гэтага дня ён:

— больш не напіша, не падпіша, не надрукуе ніякім чынам ніводнай фразы, што скажае, на ягоную думку, праўду;

— такой фразы ні ў прыватнай гутарцы, ні прылюдна ня выкажа ні ад сябе, ні са шпаргалкі, ні ў ролі агітатара, настаўніка, выхавальніка, ні паводле тэатральнае ролі;

— жывапісна, скульптурна, фатаграфічна, тэхнічна, музычна ня выявіць, не суправодзіць, не ратрансьлюе ніводнай хлусьлівай думкі, ніводнага скажэньня праўды, якое ён бачыць;

— не спашлецца ні вусна, ні пісьмова на «кіраўнічую» цытату, каб дагадзіць, падстрахавацца, для посьпеху свае працы, калі цытаванае думкі не падзяляе цалкам ці яна недарэчы;

— ня дасьць прымусіць сябе ісьці на дэманстрацыю ці мітынг, калі гэта супраць ягонага жаданьня і волі; ня возьме ў рукі, не падыме транспаранта, лёзунгу, якога не падзяляе цалкам;

— не падыме рукі за прапанову, якой не падзяляе шчыра; не прагаласуе ні адкрыта, ні таемна за асобу, якую лічыць нявартай або сумнеўнай;

— ня дасьць загнаць сябе на сход, дзе чакаецца прымусовае, скажонае абмеркаваньне пытаньня;

— зараз жа пакіне паседжаньне, сход, лекцыю, спэктакль, кінасэанс, як толькі пачуе ад прамоўцы хлусьню, ідэалягічную лухту ці бессаромную прапаганду;

— не падпішацца і не набудзе такой газэты ці часопісу, дзе інфармацыя скажаецца, падставовыя факты хаваюцца.

Мы пералічылі, вядома, ня ўсе магчымыя і неабходныя ўхіленьні ад хлусьні. Але той, хто пачне ачышчацца, — ачышчаным поглядам убачыць і іншыя выпадкі.

Так, па першым часе атрымаецца няроўна. Камусьці давядзецца страціць працу. Маладым, што жадаюць жыць паводле праўды, гэта вельмі ўскладніць іх маладое жыцьцё напачатку: бо ж і адказы на ўроках напханыя хлусьнёю, трэба выбіраць. Але ж ні для кога, хто хоча быць сумленным, тут не засталося шчылінкі: нідзе нікому з нас нават у самых бясьпечных тэхнічных навуках не абмінуць хоць аднаго з названых крокаў — у бок праўды ці ў бок хлусьні; у бок духовай незалежнасьці або духовага лёкайства. І той, каму ня стане сьмеласьці нават на абарону сваёй душы, — няхай не ганарыцца сваімі перадавымі поглядамі, не выстаўляецца, што ён акадэмік ці народны артыст, заслужаны дзяяч ці генэрал, — так няхай і скажа сабе: я — быдла і баязьлівец, мне абы сытна і цёпла.

Нават гэты шлях — самы памяркоўны з усіх шляхоў супраціву — для нас, што засядзеліся, будзе нялёгкі. Але настолькі ж лягчэйшы за самаспаленьне ці нават галадоўку: полымя не ахопіць твайго тулава, вочы ня лопнуць ад жару, і чорны хлеб з чыстай вадой заўсёды знойдзецца для тваё сям'і.

Здраджаны намі, падмануты намі вялікі народ Эўропы — чэхаславацкі — няўжо не паказаў нам, як нават супраць танкаў выстойваюць няўзброеныя грудзі, калі ў іх годнае сэрца?

Гэта будзе нялёгкі шлях, — але самы лёгкі з магчымых. Нялёгкі выбар для цела, — але адзіны для душы. Нялёгкі шлях, — аднак ёсьць жа ў нас людзі, нават дзясяткі іх, хто гадамі трымаецца ўсіх гэтых пунктаў, жыве паводле праўды.

Такім чынам: ня першымі ступіць на гэты шлях, а — далучыцца! Тым лягчэйшым і тым карацейшым акажацца ўсім нам гэты шлях, чым больш дружна і густа мы на яго ступім! Будуць нас тысячы — і ня справяцца ні з кім нічога зрабіць. Стануць нас дзясяткі тысяч — і мы не пазнаем нашай краіны!

Калі ж мы збаімся, дык досыць жаліцца, што хтосьці нам не дае дыхаць, — гэта мы самі сабе не даём! Прыгнёмся яшчэ, пачакаем, а нашы браты-біёлягі дапамогуць наблізіць чытаньне нашых думак і пераробку нашых генаў.

Калі і ў гэтым мы збаімся, дык мы — нікчэмныя, безнадзейныя, і гэта да нас пушкінская пагарда:

> Навошта статкам дар свабоды?
> .....
> Іх спадчына ад роду ў роды
> Таўро, кайданы і бізун.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Возера Сьвіцязь:** Фотаальбом / А.Ласьмінскі. — Менск: Беларусь, 2003. 3000 ас.

Здымкі, зьмешчаныя ў выданьні, патлумачаць, чаму ў Адаму Міцкевічу прачнуўся паэтычны дух і чаму паэт усё жыцьцё апяваў хараство Літвы. Альбом каштуе каля 7000 руб.

**Гілевіч Н. Сказ пра Лысую гару:** У апошняй аўтарскай рэдакцыі. — Менск: Белфранс, 2003. — 48 с.: іл. 500 ас.

Упершыню за 30 гадоў свайго існаваньня паэтычны бэстсэлер друкуецца пад прозьвішчам Ніла Гілевіча. У выданьні зьмешчаныя ткасама чарнавыя аўтографы легендарнага твору. У «Акадэмкнізе» каштуе 1860 руб.

**Амбражевич Н. Оршанская битва 1514 года: Военно-исторический аспект** / Ін-т сац.-паліт. дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта Рэсп. Беларусі. — Менск, 2003. — 40 с. 500 ас.

**Локотко А. Архитектурно-ландшафтная топография белорусско-русского этничного пограничья.** — Мінск, 2003. — 107 с. 250 ас.

**Чигринов Г. История Беларуси с древности до наших дней:** Учеб пособ. — Менск: Кніжны Дом, 2004. — 672 с. 4255 ас.

Як сказана ў прадмове, пры стварэньні кнігі былі ўлічаная гістарыяграфічныя хібы «плюралістычных» 1990-х, калі некаторымі аўтарамі «актуалізаваліся нязначныя гістарычныя факты, рабіліся пасьпешлівыя высновы». Як вынік такога падыходу — адсутнасьць у разьдзеле «Беларусь у першыя гады савецкай улады. Грамадзянская вайна і замежныя інтэрвэнцыі (1917—1920 г.)» асобнага падразьдзелу пра ўтварэньне БНР. Напэўна, «нязначны факт»... Кштуе кніга блізу 17000 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**



# Галоўнае — працэс!

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Чыстая перамога

Альпіністы Ірына Велянкова і Валеры Майсеенка, пра ад'езд якіх у Паўднёвую Амэрыку «НН» пісала, пакарылі найвышэйшы пункт кантынэнту — гару Аканкагуа. Да гэтага дня яны рыхтаваліся некалькі гадоў. А ўжо на наступным тыдні вернуцца ў Беларусь, каб плянаваць штурм новага «сямітысячніка». Дарога, рыштунак, абсталяваньне, трэніроўкі, абмарожаныя рукі — каб пастаяць хвіліну на вяршыні. Зрэшты, альпінізм — спорт сумленьнейшы за культмасавыя віды. Допінг тут не дапаможа, а выдаткі намнога пераўзыходзяць прыбыткі. На выхадзе застаецца толькі перамога над сабой у чыстым выглядзе.

## Расейскія падводнікі

У расейскіх ракетчыкаў — поўнае фіяска. Калі балістычная ракета, якая мусіла стартаваць з борту падводнага чаўна «Новамаскоўск» і накрыць цэль на Камчатцы, нават не паляцела, яны яшчэ млява апраўдваліся. Але калі наступная ракета з падлодкі «Карэлія» ўзарвалася праз паўтары хвіліны ў верхніх слаях атмасфэры, усё стала ясна. Амэрыка можа спаць спакойна. А можа, гэта толькі прыём такі: робіць выгляд, а пасьля як ударыць!..

## Маталі ня раб

20-гадовы маўрытанец Маталі аддае перавагу сьмерці перад вяртаньнем дадому. У яго няма прозьвішча. Ён — раб, як і яго маці, браты, сёстры. Ён кінуў гаспадарскіх вярблюдаў, якіх пасьвіў, і зьбег. На такі крок Маталі змусілі пагрозы гаспадароў: пабачыўшы, што хлапец мае непакорны нораў, яны дэкляравалі забіць яго, каб застрашыць іншых. Цяпер Маталі пад аховай паліцыі, якая ніяк ня можа змусіць яго вярнуцца. Сілком рабіць гэтага нельга: рабства ў краіне афіцыйна забаронена з 1981 г. Але пераламаць 700-гадовую традыцыю няпроста. Ад часу, калі ў краіне зьявіліся маўры ды панявольлі чарнаскурае насельніцтва, у гэтым пляне мала што зьмянілася. Дабрабыт і жыцьцё рабоў цалкам залежаць ад настрою гаспадара. Ня верыцца, што гэта наша Зямля і 2004-ы год. А ці верыцца, што 50 гадоў таму ўся сялянская Беларусь ня мела пашпартоў?

**СМ**

**Запрашаем на падарожжа 22 лютага** (нядзеля) па Шчучынскім раёне: **Мураванка — Жалудок — Ішчална — Вялікае Мажэйкава — Старыя Васілішкі — Васілішкі — Новы Двор — Ражанка — Шчучын.**

**29** лютага (нядзеля) — у Іўеўскі й Воранаўскі раёны: Лаздуны — Трабы — Сурвілішкі — Жамыславы — Геранёны — Тракелі — Гародна — Беняконі — Гайцюнішкі.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-36, 776-24-35 (Павал)

**29** лютага запрашаем на экскурсію **«Гістарычны Пінск».**
Праграма туру:
**Пінск:**
капліца XVII ст.; Варварынская царква; палац Бутрымовіча; касьцёл Карла Барамея; манастыр францішканцаў; касьцёл Ушэсьця XVIII ст.; жылая забудова, касьцёл Божай Маці, манастыр езуітаў; сядзіба, драўляная царква XIX ст.; музэі горада;
**Косава:** палац; сядзіба Касьцюшкаў;
**Паречча:** парк Скірмунтаў.
Кошт — 18 000 р. для дзяцей і 21 000 р. для дарослых.
Тэлефануйце: 8-029-755-03-70, 222-88-61, 222-88-76 (ф).

## Зелімхан Яндарбіеў
## Нана

Хаваючы вочы, паўнюткія потайных сьлёз,
Глыбокімі ўздыхамі маці ўзіраецца ў сына.
Трывогу з душы не здымае цяжкога спатканьня хвіліна.
Бязьлітаснасьць сьвету жахае ашчадніцу сьлёз.

Ні боль, ні трывога сьвет ані кранае, адной
Да сэрца Сусьвет прытуліць лёс дазволіў матулі.
Матуліна сэрца ратунку крычыць, каб пачулі,
Але да гаротніцы сьвет адвярнуўся сьпіной.

Каб сыну ня выплакаць сэрца, асьцерагаецца слоў,
Бо чуе, як сын у грудзёх у закрацьці гаркоту трымае.
І кожнага разу матуліна роспач нямая
Праводзіла сына на бой, каб вярнуўся дамоў.

Чачэнская маці душою Краіны была.
Крык радасьці й гора нячутны быў ёю пачуты.
Каб сын не пачуў думак ейных пакуты,
Трымала спакой, як над прорвай скала.

Ды як ні стараюцца ўтойвацца вочы яе,
Трывога на выпасы волі ірвецца няспынна.
У матчыным сэрцы — душа Богу ўдзячная сына,
Таму ў вочы сьмерці глядзеці ёй моцы стае.

*Пераклад Рыгора Барадуліна*

## КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі:**
**4.** Зь яго робяць сьвечкі. **9.** Калі яго няма, не галасуюць. **10.** Працоўны кабінэт кока. **11.** Ня першы ўкос. **12.** Гэтай дэталью плуг розьніцца ад сахі. **13.** «Позьняю ноччу зь бясьсілымі зоркамі стылымі, Калі у глыбокіх дварах паміраюць вятры...» (назва вершу У.Караткевіча). **18.** Украінскі крыжачок (гаворка пра харэаграфію). **20.** Вельмі моцная цэгла, у якую не пранікае вільгаць. **21.** ... велічы або перасьледаваньня. **22.** Белыя браты эрытрацытаў. **23.** Глухі закуток. **25.** Прыстасаваньне для плаваньня, якое не рэкамэндуецца склейваць. **27.** Прафэсія лынькоўскага Бені. **28.** Трапічная атрутная расьліна, якой натхняўся Аляксандар Пушкін. **32.** Аўтар словаў да гімну Полацку, а таксама тэкстаў да песьняў гурту «Мясцовы час». **33.** Яна і ў каня над капытом, і на стале ў гаршку. **36.** Сапраўднае прозьвішча Нікіцыя Знасілава. **37.** Пакліканьне Дэмасфэна. **38.** У Крамлі ёсьць цар-... .

**Па вэртыкалі:**
**1.** З націскам на першы склад — лёс, перадвызначэньне ў індусаў, з націскам на другі — малая радзіма Івана Шамякіна. **2.** Народны інструмэнт зь лютневай сям'і, зь якім Піт Паўлаў часам здраджвае гітары. **3.** «І дзядзька тут жа, распрануўшысь, Сядзеў на кукішках, сагнуўшысь. Прад ім стаяў гаршчок і ... І кошык з бульбай; тут жа блізка». (Якуб Колас). **5.** Агульнае найменьне для поўні, ветаха, маладзіка і спаду. **6.** Ласо татарскіх каўбояў. **7.** Самы імпэтны беларускі рок-гурт, пераможца «Басовішча-2001». **8.** У француза яна шэрая. **14.** Участак поля, аднародна засеяны. **15.** Распаўсюднік дэзінфармацыі. **16.** Кавалак чыгункі паміж дзьвюма станцыямі. **17.** Фарба чырвонага колеру зь сярністай ртуці. **19.** За іх садзяць. **21.** Рэчка, на якой быў заснаваны Менск. **24.** Табліца формаў скланеньня або спражэньня якога-небудзь слова. **26.** Сталіца Альбаніі. **29.** Пітво алімпійскіх багоў. **30.** Рабочы абутак Аляксандра Глеба. **31.** Залежны ад сюзэрэна. **34.** У слове «сон» ён адзін, у слове «жыцьцё» іх два. **35.** Шырокае жаночае паліто з футра, пэўная прыкмета «буржуазнага загніваньня».

**Сьвятлана Панкавец, СМ**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** свайго дарагога мужа Алега з Днём сьвятога Валянціна. Твая Алена

**Алесю і Максіма** Чарняўскіх віншуем з нараджэньнем дачкі. А Міхася Чарняўскага — з траядзедзьдзем! Археолягі

**Віншую** сваю сяброўку Насту з народзінамі. Жадаю посьпехаў. Юлія

### КАНТАКТЫ

**Лошыца-2.** Беларуская сям'я з 2-гадовай дачкой шукае аднадумцаў і прыяцеляў у новым мікраРаёне. Т.: 8-029-672-19-14

**Сутнасьць** угледзіш праз гэтыя словы: любоў да Радзімы, павага да мовы. МІ «Вока». www.voka.by.ru

### КНІГІ

**Набуду** «Энцыклапэдыю гісторыі Беларусі», т.1. Т. (у Мазыры): 37-3-92, 34-5-54

### ПРАЦА

**Патрэбна** беларускамоўная няня для дзяўчынкі (2 гады 2 месяцы). Раён Опэрнага тэатру. Тры дні на тыдзень. Т.: 284-61-63, 8-029-639-16-81

**Урокі** баўгарскай мовы. Індывідуальны падыход. Беларускамоўным навучэнцам таньней. Т.: 262-52-86

**Шукаю** аднадумцаў для працы ў вядомай фірме. Т. (у Слуцку): 61-9-64

**Шукаю** працу ў інтэлігентным асяродку. Т.: 221-21-81. Слава

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

## IN MEMORIAM

# Алесь Усюкевіч

У Казахстане памёр Алесь Усюкевіч, удзельнік Саюзу вызваленьня Беларусі 1946—47 г. Ён нарадзіўся ў 1925 г. у в.Хадасы на Навагрудчыне. У вайну скончыў настаўніцкія курсы, працаваў у вясковай школе. Летам 1944-га быў мабілізаваны ў Чырвонае Войска, ваяваў, меў баявыя ўзнагароды. Пасьля дэмабілізацыі вярнуўся ў Навагрудак, дзе зь сябрамі стварыў падпольную арганізацыю «Саюз Вызваленьня Беларусі», які дзейнічаў на тэрыторыі былой Баранавіцкай вобласьці. У траўні 1947 г. Усюкевіч быў арыштаваны, падчас допыту ў «амэрыканцы» спрабаваў забіць міністра дзяржбясьпекі Цанаву. Зьняволеньне адбываў у Казахстане, дзе і застаўся жыць, стварыў сям'ю. Памёр Алесь Усюкевіч 10 студзеня 2004 г. у Паўладары.

Сьветлая памяць!

**Сяргей Ёрш**

«Наша Ніва» дзякуе спадарыні Эльжбеце Смулковай з Варшавы за падтрымку.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3518. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 18.02.2004.
Замова № 1014.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а